75 мірных гадоў
Беларусь памятае!

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 мая 2020 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 89 (29203)

# Вялікай Перамозе — вялікая пашана



Фота БелТА.

## Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі на ваенным парадзе ў азнаменаванне 75-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 9 мая 2020 г.

Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі і афіцэры!

Дарагія ветэраны Вялікай Айчыннай вайны!

Паважаныя суайчыннікі і госці Беларусі!

Віншую вас з Днём Перамогі!

Гэта свята для нас свяшчэннае.

Трагедыя беларускага народа, які вынес на плячах тытанічны груз страт і разбурэнняў самай жорсткай вайны дваццатага стагоддзя, несувымерная ні з якімі цяжкасцямі сённяшняга дня.

Нават думка здрадзіць традыцыям, якія вось ужо 75 гадоў праслаўляюць гісторыю Вялікага Подзвігу пераможцаў, для нас недапушчальная.

У гэтым ашалелым, страціўшым арыенціры свеце знойдуцца людзі, якія асуджаюць нас за месца і час правядзення гэтага свяшчэннага дзейства. Хачу ім сказаць па-чалавечы: не спяшайцеся рабіць высновы, а тым больш асуджаць нас — нашчадкаў Перамогі, беларусаў. Мы проста не маглі інакш, у нас не было іншага выбару, а калі і быў бы, мы зрабілі б гэтак жа, таму што на нас глядзяць вочы загінулых за нашу свабоду савецкіх салдат, вочы закатаваных у засценках гестапа партызан і падпольшчыкаў, вочы старых, жанчын і дзяцей Хатыні. Яны вельмі хацелі жыць, але памерлі, каб жылі мы. І сучасная Беларусь — гэта помнік той страшнай вайне, загінулым, закатаваным і спаленым. Жывая памяць і жывы помнік.

І няхай у гэтым годзе ваенны парад у Мінску будзе адзіным на постсавецкай прасторы, ён пройдзе ў гонар усіх савецкіх воінаў, якія вызвалілі свет ад нацызму.

Сёння мы ўшаноўваем подзвіг нашых бацькоў і дзядоў. Іх шлях да Перамогі быў абмыты слязамі маці, жонак і дзяцей, паліты крывёй загінулых у баях таварышаў і мірных жыхароў, авеяны попелам спаленых ворагам вёсак.

Мы схіляемся перад подзвігам рускіх і беларусаў, украінцаў і яўрэяў, татар і казахаў, таджыкаў і ўзбекаў, кыргызаў і туркменаў, грузін, армян, азербайджанцаў і малдаван, латышоў, літоўцаў, эстонцаў, усіх жыхароў Савецкага Саюза, байцоў руху Супраціўлення Еўропы, нашых саюзнікаў — ЗША, Англіі і Кітая. Іх мужнасць, адвага і гатоўнасць памерці за Радзіму сталі страшнай зброяй адплаты для гітлераўскіх катаў і іх сатэлітаў.

ISSN 1990 - 763X

Паслядоўнікам нацысцкай ідэалогіі, захопнікам з празмернымі геапалітычнымі амбіцыямі гісторыя дала ўрок. Яго сэнс просты і справядлівы — народ, які абараняе родную краіну, свае сем'і і будучыню дзяцей, непераможны.

Беларусь стала на шляху агрэсара жывым шчытом. Тут, на нашай зямлі, прайшоўшы паў-Еўропы, гітлераўцы ўпершыню сустрэлі такое нястрымнае супраціўленне.

Геройчная абарона Брэсцкай крэпасці, горада Магілёва доўжылася значна даўжэй, чым захоп многіх еўрапейскіх дзяржаў.

Менавіта ў жорсткіх баях сорак першага, у тым ліку і на беларускай зямлі, пахіснулася ўпэўненасць ворага ва ўласнай перавазе, былі закладзены асновы будучай Вялікай Перамогі.

Ва ўкладзе беларускага народа ў разгром фашызму няма ніякіх сумненняў. Гэта мільён 300 тысяч нашых воінаў, якія змагаліся ў радах Чырвонай Арміі.

Гэта больш як 400 тысяч падпольшчыкаў і партызан да канца сорак трэцяга года кантралявалі 60 працэнтаў акупіраванай тэрыторыі краіны. Гэта гібель кожнага трэцяга беларускага жыхара, які засланіў сабой дарогу нацыстаў далей, на ўсход, на сталіцу нашага Саюза.

І пакуль нашы сэрцы адзываюцца болем за тых, хто не вярнуўся з палёў бітваў, пакуль гучыць праўда аб той вайне — мы памятаем!

Бо за кожны дзень мірнага і свабоднага жыцця заплачана мільёнамі ахвяр і скалечаных вайной лёсаў.

Мы назаўсёды звязаны кроўнымі вузамі з брацкімі народамі, разам з якімі нашы бацькі і дзяды спынілі катастрофу дваццатага стагоддзя.

Але свет ігнаруе трагічныя ўрокі мінулага. І чым далей мы аддаляемся ад падзей Вялікай Айчыннай вайны, тым агрэсіўней і небяспечней ён становіцца.

Планета накаляецца новымі ачагамі ўзброеных канфліктаў. Зноў гінуць мірныя людзі. І на гэтым фоне адраджаюцца ідэі нацызму.

Іх новы след — разбураныя помнікі воінам-вызваліцелям, гераізацыя гітлераўскіх злачынцаў, фальсіфікацыя гістарычных фактаў Другой сусветнай вайны.

Беларусь — міралюбівая і адкрытая краіна. Але наш гістарычны вопыт наглядна паказаў, што дыпламатыя міждзяржаўнага дыялогу не пераканаўчая без наяўнасці эфектыўнай сістэмы бяспекі.

Але, нягледзячы на сучасныя выклікі, святочны парад, прысвечаны Дню Перамогі, сённяшні наш парад — гэта не дэманстрацыя сілы, а даніна памяці нашай геройчнай гісторыі.

Салдаты, афіцэры і генералы беларускай арміі — нашчадкі пераможцаў. Вы сёння пройдзеце ў адным страі як прадаўжальнікі слаўных традыцый савецкіх воінаў.

Пакажаце новыя ўзоры ўзбраенняў і ваеннай тэхнікі, створаныя ўжо на айчынных прадпрыемствах абароннага сектара. Зробіце гэта ў гонар дзядоў і прадзедаў, якія завяшчалі нам мірную краіну.

Наш святы абавязак — захаваць яе для будучых пакаленняў. Зберагчы праверанае ў суровых баях адзінства народаў.

Беларусь, як і раней, будзе верная памяці Вялікай Перамогі. Перамогі, якая з'яўляецца агульным здабыткам рэспублік былога Савецкага Саюза.

Дарагія ветэраны Вялікай Айчыннай вайны!

Гісторыя жыцця вашага пакалення — сапраўдны прыклад мужнасці, доблесці і духоўнай велічы. Вы былі і назаўсёды застанецеся пераможцамі.

Сёння мы схіляем галовы перад памяццю тых, хто аддаў жыццё ў імя нашай будучыні. Дзякуем усім, хто здзейсніў працоўны подзвіг.

Абяцаем зберагчы праўду аб той вайне на славу герояў, якія выратавалі многія народы ад генацыду і рабства.

Нізкі паклон і бязмежная ўдзячнасць вам за Вялікую Перамогу! Беларусь будзе памятаць!

Дарагія суайчыннікі!

У гэты ўрачысты дзень я хачу пажадаць усім перш за ўсё моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту, мужнасці вам і стойкасці ў гэты нялёгкі час!

Няхай неба над Беларуссю заўсёды будзе мірным!

З Днём Перамогі!

Ура!

# ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОЗЕ —



**ВАЕННЫ парад ў Мінску ў азнамяненне 75-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне прайшоў у складзе пешай і механізаванай калон і паветранага эшалона. Удзел у парадзе ўзялі больш за тры тысячы ваеннаслужачых і звыш 150 адзінак тэхнікі.**

У складзе пешай калоны ўдзельнічала 19 парадных разлікаў: ад устаноў адукацыі, афіцэрскія і курсанцкія парадныя разлікі, разлік ад 120-й і 11-й асобных гвардзейскіх механізаваных брыгад, жаночы парадны разлік ад Міністэрства абароны, парадны разлік ад Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, разлікі ад Міністэрства ўнутраных спраў, у тым ліку адзін жаночы, парадны разлік ад Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, парадны разлік ад 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады і парадны разлік ад 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады.

Акрамя таго, у парадзе ўзялі ўдзел парадны разлік роты ганаровай варты, зводны ваенны аркестр, лінейныя роты ганаровай варты, сцяганосцы ад роты ганаровай варты.

У складзе механізаванай калоны ўдзельнічалі 16 парадных разлікаў, у тым ліку сучаснай тэхнікі, разлік ад Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта і разлік у складзе танка Т-34-85. Усяго ў складзе механізаванай калоны было задзейнічана 206 адзінак, непасрэдна ў калоне прайшло 169 адзінак тэхнікі і ўзбраення. Упершыню на парадзе былі прадэманстраваны рэактыўная сістэма залпавага агню «Флейта» і рабатызаваны комплекс «Вістл».

Паветраны эшалон склалі 36 верталётаў і самалётаў, а ўсяго ў падрыхтоўцы было задзейнічана 47 паветраных суднаў.

Урачыстасць працягнулася пляц-парадам зводнай роты ганаровай варты, а ў фінале адбыўся грамадзянскі эпізод «Беларусь памятае».

Першая яго частка праслаўляла подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і захаванне памяці пра май 45-га. Сцягі колеру сцяга Перамогі ў руках маладых спартсменаў перакліваліся з чырвоным сцягам на будынку Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, сімвалізуючы нашу памяць пра подзвіг дзядоў і прадзедаў і гатоўнасць моладзі здзяйсняць новыя, мірныя перамогі ў славу Беларусі.

Другая частка эпізоду сімвалізавала пераемнасць пакаленняў і была прысвечана суверэннай Беларусі, народ якой памятае, што вытокі незалежнасці Айчыны — у Вялікай Перамозе. Кульмінацыйным момантам часткі стаў вынас дзяржаўнага сцяга Беларусі.

Трэцяя частка была прысвечана патрыятычнай акцыі, якая зарадзілася ў Беларусі па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы, — «Беларусь памятае», пад дэвізам якой праходзяць урачыстасці, прысвечаныя 75-й гадавіне Вялікай Перамогі. Цэнтральным момантам часткі стаў вынас палотнішча «Беларусь памятае», створанага падчас правядзення акцыі актывістамі БРСМ. На палотнішчы напісаныя імёны Герояў Савецкага Саюза і поўных кавалераў ордэна Славы — выхадцаў з Беларусі.

Увечары мінчан і гасцей сталіцы на плошчы Перамогі чакаў канцэрт «У славу агульнай Перамогі!», а фінальным акордам сталі залпы салюту.







Фота БелТА.

# ВЯЛІКАЯ ПАШАНА

## БЕЛАРУСЫ — РАЗАМ





Трыбуны для гледачоў парада Перамогі былі поўныя ўжо з ранку. Беларусы прыходзілі на свята працоўнымі калектывамі, цэлымі сем'ямі. Пачэсныя госці, якім удзялялася асаблівая ўвага, — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

«Змагаемся з каранавірусам, прыйшлі павіншаваць усіх са святам. Хочацца пажадаць усім здароўя, берагчы сябе, не падаць духам», — расказалі супрацоўніцы 10-й гарадской клінічнай бальніцы. Адна з жанчын з гонарам згадала прадзеда, які распісаўся на сцяне рэйхстага і памяць пра якога застаецца дагэтуль.

«Свята вельмі ўрачыстае, значнае для ўсіх людзей увогуле і беларусаў у прыватнасці. Вірус скончыцца, пераадолеем і пераможам так, як калісьці перамаглі ў вайне», — дадалі медыкі.

«Для мяне дзень Перамогі — гэта шчасце, радасць, самае галоўнае свята», — падхапіў і самы малодшы член калектыву, сын адной з медработніц.

Для старшыні Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі, дэпутата Палаты прадстаўнікоў пятага і шостага склікання Вадзіма Дзевятоўскага Дзень Перамогі ў першую чаргу — памяць пра ўласных блізкіх, бабуль і дзядуляў, для якіх 9 Мая было самым чаканым і жаданым святам: «Заўсёды адчувалася ў іх унутраная ўрачыстасць... Са сціпласцю, ніхто не вучыў нас жыць — проста ціха, але вельмі святочна святкавалі. Расказвалі праўду аб вайне, і для мяне менавіта іх праўда з'яўляецца асновай. Я гэтага ніколі не забуду, і сёння тое, пра што яны мне казалі, перадаю свайму сыну. І для мяне гэта святое».

Асабіста для Вадзіма Дзевятоўскага спрэчкі наконт мэтазгоднасці правядзення парада недарэчныя, таму што парад, на яго думку, як даніна павагі, павінен адбывацца пры любых умовах.

«Гены пераможцаў — вось гэта важна», — маркуе прызёр Алімпійскіх гульняў, нагадаўшы, што беларусы ніколі не здаваліся. Вадзім Дзевятоўскі марыць, каб больш ніхто і ніколі на нашай зямлі і ўвогуле на планеце не аддаваў жыцця дзеля міру.

**Варвара МАРОЗАВА.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**



## АГУЛЬНЫ ЗДАБЫТАК

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў сваім замежным калегам віншаванні з 75-годдзем Вялікай Перамогі. Віншавальныя пасланні кіраўніка дзяржавы адрасаваны лідарам краін постсавецкай прасторы, а таксама дзяржаў, якія ўваходзілі ў антыгітлераўскую кааліцыю, вядомым палітычным дзеячам, кіраўнікам інтэграцыйных структур. Пра гэта паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

У віншавальным пасланні Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што гэтая гістарычная падзея з'яўляецца свяшчэнным святам для ўсіх, хто шануе подзвіг савецкага народа, які адстаяў мір і незалежнасць роднай зямлі ў самай жорсткай і разбуральнай за гісторыю чалавецтва вайне.

«Неацэнны ўнёсак у агульную Перамогу над фашызмам беларусаў і расіян. Мы ганарымся сілай духу і бяспрыкладнай мужнасцю доблесных воінаў і працаўнікоў тылу. Схіляем галовы перад тымі, хто аддаў жыццё за Айчыну. Перакананы, што адзінства, дружба і ўзаемадапамога нашых народаў, правераныя ў вельмі цяжкіх выпрабаваннях ваеннага часу, застануцца непарушнай асновай для далейшага стратэгічнага развіцця беларуска-расійскага партнёрства», — гаворыцца ў віншаванні.

У віншаванні Старшыні КНР Сі Цзіньпіну Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што храбрасць і гераізм беларускага і кітайскага народаў у вызваленчай барацьбе атрымалі сусветнае прызнанне. Абедзве краіны ўвайшлі ў лік дзяржаў — заснавальніц ААН.

У пасланнях на адрас амерыканскага лідара Дональда Трампа, а таксама Каралевы Вялікабрытаніі Лізаветы II і Прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона падкрэсліваецца, што адкрыццё другога фронту, высадка войскаў саюзнікаў у Нармандыі наблізілі агульны трыумф і з'яўляюцца яскравым прыкладам мужнасці і рашучасці народаў, аб'яднаных барацьбой за свабоду і незалежнасць.

На адрас Аляксандра Лукашэнкі і беларускага народа таксама пастурпаюць шматлікія віншаванні з гадавінай Перамогі ад кіраўнікоў краін блізкага і далёкага замежжа, вядомых палітычных дзеячаў, кіраўнікоў інтэграцыйных аб'яднанняў.

«Перамога над нацызмам — наш агульны вялікі здабытак. Свяшчэнны абавязак цяперашніх пакаленняў расіян і беларусаў — назаўсёды захаваць памяць пра тых, хто цаной незлічоных ахвяр і нягод адстаяў свабоду роднай зямлі, акружыць увагай і клопатам нашых дарагіх ветэранаў», — гаворыцца ў віншаванні ад Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна.

Віншавальныя пасланні таксама паступілі ад Прэзідэнта Казахстана Касым-Жамарта Такаева, Першага Прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева, Прэзідэнта Арменіі Армена Саркісяна і прэм'ер-міністра гэтай краіны Нікола Пашыняна, Прэзідэнта Кыргызстана Сааранбая Жээнбекава, Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева, Прэзідэнта Малдовы Ігара Дадона, Прэзідэнта Таджыкістана Эмамалі Рахмона, Прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава, Прэзідэнта Сірыі Башара Асада.

Віншаванні на адрас кіраўніка беларускай дзяржавы і народа Беларусі са святам Перамогі працягваюць паступаць.

Блізкая ўлада

## ТЫДЗЕНЬ ДЛЯ ЗВАРОТАЎ

**Памочнікі Прэзідэнта — інспектары па абласцях і горадзе Мінску правядуць з 11 да 19 мая прамыя тэлефонныя лініі для насельніцтва, паведамляе БелТА.**

Адміністрацыя Прэзідэнта арганізуе гэтыя мерапрыемствы ў рамках работы са зваротамі грамадзян, а таксама для кантролю ўзаемадзеяння мясцовых органаў улады з насельніцтвам.

У абазначаныя даты **з 9.00 да 12.00** жыхар любога населенага пункта, не выязджаючы, зможа аператыўна звярнуцца па пытанні, якое яго хвалюе, непасрэдна да прадстаўніка Прэзідэнта ў канкрэтным рэгіёне або давесці да яго свой пункт гледжання па найбольш актуальных праблемах сацыяльнага, эканамічнага і іншага характару.

Так, **11 мая ў Брэсцкім аблвыканкаме** прамую тэлефонную лінію правядзе **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль Мечыслававіч МАРКЕВІЧ.** Пытанні можна задаць па тэлефоне (0162) 21 31 21.

**12 мая ў Гомельскім аблвыканкаме — памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Вітольдавіч ШУЛЕЙКА.** Пытанні можна задаць па тэлефоне (0232) 33 12 37.

**13 мая ў Віцебскім аблвыканкаме — памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль Канстанцінавіч ЛІНЕВІЧ.** Пытанні можна задаць па тэлефоне (0212) 22 22 22.

**14 мая ў Мінскім аблвыканкаме — памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар Уладзіміравіч ЯЎСЕЕЎ.** Пытанні можна задаць па тэлефоне (017) 500 41 60.

**15 мая ў Магілёўскім аблвыканкаме — памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Андрэй Міхайлавіч СУБОЦІН.** Пытанні можна задаць па тэлефоне (0222) 50 18 69.

**18 мая ў Гродзенскім аблвыканкаме — памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Іван Антонавіч ЛАЎРЫНОВІЧ.** Пытанні можна задаць па тэлефоне (0152) 73 56 44.

**19 мая ў Мінгарвыканкаме — памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінску Віталь Аляксандравіч ПРЫМА.** Пытанні можна задаць па тэлефоне 222 44 44.

# Героі ніколі не будуць забытыя

## Аляксандр Лукашэнка напярэдадні Дня Перамогі ўзяў удзел у цырымоніі закладвання капсул з зямлёй з месцаў воінскай славы


Фота БелТА.

Гэтай урачыстасцю ў сталічным храме-помніку ў гонар Усіх Святых у памяць аб ахвярах, якія паслужылі ратаванню нашай Айчыны, завяршылася акцыя «У славу агульнай Перамогі!».

У крыпце храма знаходзіцца зямля з палёў усіх вялікіх гістарычных бітваў у абарону Айчыны. У 2010 годзе ў нішах бакавой сцяны крыпты былі захаваны астанкі невядомых салдат вайны 1812 года, Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, знойдзеныя спецпадраздзяленнем Міністэрства абароны Беларусі падчас пошукавых экспедыцый. У памяць пра ўсіх загінулых запалена негасімая лампада.

Аляксандр Лукашэнка ўсклаў кветкі да цэнтральнай нішы, у суправаджэнні настаяцеля храма протаіерэя Фёдара Поўнага запаліў свечку памяці пра загінулых воінаў.

На цырымоніі прысутнічалі вышэйшыя службовыя асобы краіны, кіраўнікі грамадскіх аб'яднанняў, дыпламаты, прадстаўнікі рэгіёнаў. Пасля Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з удзельнікамі акцыі «У славу агульнай Перамогі!».

«Велізарны дзякуй усім вам за тое падзвіжніцтва, якое вы здзейснілі напярэдадні гэтага вялікага свята. Жадаю моцнага здароўя, мужнасці, не падайце духам — у нас абавязкова ўсё будзе добра», — звярнуўся Прэзідэнт.

Пачатак акцыі «У славу агульнай Перамогі» Прэзідэнт абвясціў 9 мая 2019 года, і на працягу года ва ўсіх рэгіёнах Беларусі праводзіліся акцыі па зборы ў капсулы зямлі з месцаў вайсковай славы. Да руху далучыліся і замежныя дзяржавы. У нішы крыпты храма ўстаноўлены капсулы з зямлёй з гарадоў-герояў Валгаграда, Керчы, Кіева, Масквы, Адэсы, Севастопаля, Смаленска, а таксама з дзяржаў, якія змагаліся з фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны.

«Прайшоў роўна год. Зямля з усіх воінскіх пахаванняў і месцаў баявой славы беларусаў сабрана ў 126 капсулах. Яшчэ адзінаццаць гарадоў-герояў і больш за дзесяць замежных краін далучыліся да гэтага праекта. І ён цяпер не мае тых меж, якія існуюць на карце», — сказаў протаіерэй.

Урачыстасць Прэзідэнт назваў сямейнай, бо «каля сцен храма, які беларусы пабудавалі самастойна, пампезнасць недарэчная». Ён параўнаў тыя часы і цяперашнія, якія маюць выклікі значна меншага маштабу, але таксама запатрабуюць ад беларусаў пэўнай стойкасці. «Мы сапраўды вымушаны стаяць, як Брэсцкая крэпасць. Яшчэ раз падкрэсліваю — вялікае бачыцца на адлегласці. Пройдзе час — і людзі, перш за ўсё вы, моладзь, ацэняць гэтыя дні. ***Я сёння ўпэўнены абсалютна, што гэта будзе цудоўная старонка ў гісторыі нашай краіны.*** Цудоўная таму, што мы з вамі выстаялі — як яны (ветэраны — **«Зв.»**) калісьці», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Салдаты Перамогі ахвяравалі свае жыцці ў імя таго, каб мы сёння жылі і хоць адночы за год з годнасцю і гонарам згадвалі герояў, перакананы Аляксандр Лукашэнка.

***«Мы зробім усё, каб вы жылі. Абавязкова жылі, таму што пакуль жывяце вы, жыве гэта памяць.*** Вы — рэальныя сведкі таго часу, і вы сёння прадстаўляеце нашых салдат, афіцэраў, генералаў, якія пасля вайны ў найцяжэйшых умовах здолелі адстаяць мір і абараніць, аднавіць нашу рэспубліку. Велізарны вам дзякуй», — звярнуўся да ветэранаў вайны і Узброеных Сіл Прэзідэнт.

### ПРАВІЛЬНЫ ШЛЯХ

Кіраўнік дзяржавы адказаў на пытанне журналіста пра публікацыі ў інтэрнэце: што на парад нібыта запрашалі тых, хто перахварэў на каранавірус. «Я сваё меркаванне ўжо выказаў: мы ніколі на такія мерапрыемствы не цягнулі людзей. Гэта, калі хочаце, маё крэда, маё патрабаванне», — падкрэсліў ён.

«Але, калі шчыра, я з задавальненнем убачыў бы на гэтым парадзе тых, хто перамог гэтымі днямі, — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка. — Не хваробу. Слухайце, хвароба — гэта самае простае, што можна цяпер перамагчы. Тое, што ў галаву ўбілі нядобрасумленныя палітыкі і іншыя. Сапраўдны псіхоз. Людзі проста сталі баяцца. І нам дорага каштавала супакоіць людзей. І я пахваліў іх зусім нядаўна — і нашых старых, і моладзь — увесь наш народ. Мы расказалі сумленна і адкрыта людзям, як трэба сябе паводзіць, а ўсё астатняе — у руках людзей».

Што датычыцца ўрачоў і медыцынскага персаналу, якія папраўляліся пасля каранавіруса і папрасіліся на парад, дык бачыць і запрашаць такіх пераможцаў — варты ўчынак для ўлады, мяркуе лідар краіны.

Ён нагадаў, што ў пачатку ўздыму захварэльнасці людзям шчыра і адкрыта расказалі, як трэба сябе паводзіць. «Мы выбралі свой шлях. І я перакананы сёння, што мы зрабілі правільна. Мы не ўявілі надзвычайнае становішча», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. І такі падыход (без увядзення каранціну, без спынення эканомікі) ужо дае плён, упэўнены ён.

У прыватнасці, 8 мая ранкам Прэзідэнту далажылі, што Віцебская вобласць ужо «пераводзіць у нармальны рэжым бальніцы, якія былі зарэзерваваныя для хворых. Рэгіён «прыходзіць да нармальнага жыцця», праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, Прэзідэнт упэўнены ў правільнасці выбранага шляху і для пераадолення другой хвалі захварэльнасці ўвосень, наконт якой ужо непакояцца многія краіны.

«Усё больш і больш людзей, нягледзячы на гэты вірус, вяртаецца да нармальнага жыцця. Толькі што я размаўляў з Прэзідэнтам Таджыкістана Эмамалі Шарыфавічам Рахмонам, з Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірамонавічам Мірзіёевым. Яны ўсе перадавалі нашаму народу самыя цёплыя пажаданні, віншаванні. Мне прыемна было пачуць, што ***яны выкарыстоўваюць менавіта наш досвед, таму што пазней за нас увайшлі ў гэту заразу»,*** — падзяліўся беларускі лідар.

### ЁСЦЬ НАД ЧЫМ ПРАЦАВАЦЬ

Прэзідэнт падкрэсліў: поспехі айчыннай медыцыны — гэта вынік таго, што ў Беларусі заўсёды сачылі за аховай здароўя, не аддалі сістэму «ў прыватныя рукі». І хоць, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, небагатай Беларусі гэта дорага абыходзілася, выдаткі вернуцца ў стакроць.

«Канешне, ёсць вельмі шмат пытанняў, шмат недахопаў. Мы фіксуем гэтыя ўсе пытанні-недахопы, і пасля заканчэння гэтай эпапеі, істэрыі, віруснай гэтай хваробы ***мы прымем адпаведныя рашэнні, якія значна ўзмоцняць нашу ахову здароўя.*** Мы бачым, што яшчэ трэба зрабіць. Але пакуль, дзякуй богу, мы трымаемся», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён з ухваленнем адзначыў, што ўпершыню па расійскім тэлебачанні ад мэра Масквы Сяргея Сабяніна пачуў «цвярозую заяву» аб прапорках за шматлікія выяўленні выпадкаў віруса.

«Кажа: а за што вы нас папракаеце, масквічоў, што ў нас шмат выяўляецца гэтага віруса? Дык правільна, за гэта трэба хваліць расіян, масквічоў і іншыя краіны, якія шмат праводзяць тэстаў. Чым больш тэстаў — тым больш выяўляецца каранавірус. Але не гэта сёння галоўнае. Галоўнае, на што я арыентую ўсю краіну і ўрачоў, — смяротнасць. Мы мусім выратаваць усіх. Слухайце, праз месяц усе забудуцца, колькі мы выявілі. Усе будуць памятаць, колькі загінула людзей», — абазначыў прыярытэты Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу, што ў Беларусі адзначаецца самая нізкая смяротнасць пры такім узроўні тэсціравання. Але Прэзідэнта здзіўляе: Беларусь і Расію крытыкуюць за тое, што выпадкаў заражэння выяўляецца шмат, а Украіну — за тое, што мала.

Яшчэ адзін важны паказчык — цяжкахворыя і пацыенты, якім патрабуецца штучная вентыляцыя лёгкіх. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што з 2,5 тысячы апаратаў ШВЛ занята толькі дзесяць працэнтаў. Не менш важна, колькі пацыентаў паступіла ў бальніцы, а колькі адтуль выпісалася.

### З НАДЗЕЯЙ І ПАДЗЯКАЙ

Ад імя ветэранаў да Галоўнакамандуючага са словамі ўдзячнасці звярнуўся Віктар Костка.

— Я пражыў тры гады на акупаванай тэрыторыі на Магілёўшчыне і бачыў усё, усе жахі, усе страхі, якія наводзілі фашысты супраць мірнага насельніцтва...

— Было страшней, чым зараз? — запытаўся Аляксандр Лукашэнка.

— Безумоўна.

Ветэран падзякаваў Прэзідэнту за захаванне памяці аб подзвігах беларускага народа, пажадаў моцнага здароўя.

«Дзякуй, бацька», — адказаў кіраўнік дзяржавы.

Пасол Расіі Дзмітрый Мезенцаў па даручэнні ўдзельнікаў праекта ўручыў Прэзідэнту Беларусі першы экземпляр кнігі «Рарытэты ваенна-гістарычных музеяў Беларусі і Расіі». У кнізе сабраныя фатаграфіі і тэксты аб рарытэтах шасці музеяў. Пяцьдзясят яе старонак прысвечаныя Беларусі, пяцьдзясят — Расіі. Па словах пасла, памяць аднолькава шануецца ў абедзвюх краінах.

**Варвара МАРОЗАВА.**

---

Парламенцкі дзённік

# Прэзідэнцкія выбары

## За такую дату прагаласавалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў 8 мая

**Магчымасць правядзення выбараў 9 жніўня прапанавала разгледзець парламентарыям старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА. Гэтая дата дазволіць правесці другі тур (калі ў ім будзе патрэба) у тэрміны, абазначаныя Канстытуцыяй. Такім чынам, выбарчая кампанія стартавала 9 мая, што таксама сімвалічна, пагадзіліся з кіраўніком ЦВК дэпутаты.**

Старшыня Цэнтрвыбаркама растлумачыла, што Палата прадстаўнікоў можа прызначыць выбары на любую нядзелю жніўня: 9, 16, 23 і 30. Але апошнія дзве даты не дазваляюць правесці другі тур у акрэсленыя Канстытуцыяй тэрміны (не пазней за два месяцы да заканчэння тэрміна паўнамоцтваў Прэзідэнта — 6 лістапада, і абавязкова ў нядзелю). Выбары 16 жніўня азначалі б, што другі тур адбудзецца 30 жніўня, а гэта не дазволіла б спакойна падрыхтаваць школы да навучальнага года.

«Таму палітычнае кіраўніцтва краіны правяло адпаведныя кансультацыі і са мной, і з Уладзімірам Паўлавічам (Андрэйчанкам. — **«Зв.»**), старшынёй Палаты прадстаўнікоў, і ў прынцыпе было выпрацавана адзінае меркаванне аб правядзенні выбараў 9 жніўня», — падсумавала старшыня ЦВК.

Лідзія Ярмошына звярнула ўвагу на тое, што выбары ўпершыню будуць праходзіць ва ўмовах складанай эпідэміялагічнай абстаноўкі.

У той жа дзень Цэнтральная выбарчая камісія правяла пасяджэнне ў закрытым рэжыме — без назіральнікаў і сродкаў масавай інфармацыі.

«Будзем рэкамендаваць трымацца падобнага рэжыму ў першы час і ўсім тым, хто задзейнічаны ў выбарчай кампаніі, — паведаміла Лідзія Ярмошына дэпутатам. — Напрыклад, у сваім праекце пастановы аб парадку збору подпісаў закладваем норму пра тое, што зборшчыкі подпісаў абавязкова павінны быць забяспечаны сродкамі індывідуальнай засцярогі».

Пасяджэнні абласных, раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтаў і адпаведных Саветаў, дзе будуць утварацца тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, таксама павінны праходзіць без запрашэння назіральнікаў, прадстаўнікоў палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян, якія вылучылі свае кандыдатуры, дадала Лідзія Ярмошына. Пры гэтым адпаведныя выканаўчыя органы павінны на сваіх старонках у інтэрнэце выкладваць запісы гэтых пасяджэнняў, каб усе зацікаўленыя асобы змаглі паглядзець і прааналізаваць іх ход. Тое самае будзе рабіць і ЦВК.

Назіральнікі таксама павінны будуць выконваць рэкамендацыі Міністэрства аховы здароўя Беларусі па сацыяльным дыстанцыяванні і па забяспечанасці сродкамі індывідуальнай засцярогі.

«Мы яшчэ не ведаем, ці будуць у нас міжнародныя назіральнікі. З гэтай нагоды яшчэ трэба выпрацоўваць асобную палітычную пазіцыю разам з кіраўніком дзяржавы, — заўважыла старшыня ЦВК. — Гэтая выбарчая кампанія будзе праходзіць

# ЭСТАФЕТА ПАМЯЦІ



## СВЯТА, ЯКОЕ НАЗАЎСЁДЫ З НАМІ

**Напярэдадні святкавання юбілею Вялікай Перамогі старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ўсклалі кветкі да мемарыяла «Масюкоўшчына».**

Вельмі сімвалічна, што кіраўнікі абедзвюх палат парламента для ўшанавання памяці пра загінулых у гады вайны абралі менавіта гэты мемарыял, які знаходзіцца на месцы былога нямецкага канцлагера побач з вёскай Масюкоўшчына, што на ўскраіне Мінска. Тут у лагеры смерці — «Шталагу № 352» — было забіта і закатавана больш за восемдзесят тысяч ваеннапалонных і мірных жыхароў. А ўсяго на тэрыторыі часова акупаванай Беларусі фашысцкія каты стварылі звыш 260 канцлагераў, у якіх колькасць ахвяр таксама ішла на дзясяткі тысяч. Іх попел стукае ў нашых сэрцах.

Відаць, невыпадкова ў размове з журналістамі Наталля Качанава заўважыла, што памяць пра Вялікую Айчынную вайну была і застаецца ў сэрцы кожнага беларуса. А 9 Мая — усенароднае свята, святы дзень, які назаўсёды з намі. У гэты дзень мы аддаём даніну павагі тым, хто загінуў у барацьбе за нашу свабоду, тым, хто прайшоў праз выпрабаванні вайны, хто аднаўляў разбураную Беларусь.

Спікер верхняй палаты парламента таксама паведаміла, што з бегам часу яна ўсё больш усвядамляе і разумее трагізм тых жахлівых і невыносных ваенных падзей, веліч Вялікай Перамогі, гераізм савецкага народа. А таму наш абавязак — захаваць гэту памяць пра Вялікую Айчынную вайну і перадаць яе будучым пакаленням.

Паводле слоў старшыні Савета Рэспублікі, кожны пасляваенны год мы адзначалі свята Вялікай Перамогі. Гэта наша традыцыя, наш абавязак. Таму 9 Мая мы не маем права здрадзіць памяці пераможцаў, усіх тых, хто склаў галовы ў імя Перамогі. І як не святкаваць 9 Мая?

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка прыгадаў, што ў Беларусі, дзе загінуў кожны трэці яе жыхар, няма ніводнай сям'і, якая так ці інакш не пацярпела б ад вайны. У якасці прыкладу ён прывёў лёс уласнай сям'і. Яго бацька, дзед, іншыя сваякі ваявалі супраць ворага на розных франтах, змагаліся ў партызанскіх атрадах. І, на вялікі жаль, гінулі за Радзіму.

Па словах спікера, толькі па бацькоўскай лініі ваявалі тры чалавекі з яго родзічаў. Дзед загінуў у Белгародскай вобласці і там пахаваны. Родны брат бацькі — у Літве, дзе пахаваны на брацкіх могілках. Таму для яго сям'і 9 Мая — святая дата, да якой адносяцца з асаблівай увагай.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## «НАРОД, ЯКІ НЕ ЦЭНІЦЬ СВАЮ ГІСТОРЫЮ, НЕ МАЕ БУДУЧЫНІ»

**Такімі словамі падкрэсліў значнасць 75-годдзя Вялікай Перамогі, у гонар якой у Мінску прайшоў ваенны парад, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА. У той жа дзень пасля парада ён разам са сваімі намеснікамі ўсклаў вянок і кветкі да абеліска на плошчы Перамогі.**

«Мы не можам не шанаваць памяць. Народ, які не памятае, не цэніць сваю гісторыю, не мае будучыні», — цытуе Ігара Сергеенку БелТА.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта расказаў журналістам, што яго бацька Пётр Міхайлавіч Сергеенка прайшоў дарогамі вайны, два гады быў на фронце ў інжынернай разведцы і сапёрных войсках. «Старшы сяржант. Тры баявыя ордэны, медаль «За адвагу». Баявыя ўзнагароды, якія засталіся ад бацькі, я беражліва захоўваю ў сваёй сям'і», — прызнаўся Ігар Сергеенка. Важна берагчы такія сведчанні, якія кажуць пра подзвіг простых салдат, афіцэраў, людзей, якія змагаліся на акупаванай тэрыторыі, кавалі перамогу ў тыле, працуючы на прадпрыемствах, забяспечваючы фронт, дадаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.



«Юбілей Перамогі — гэта вялікае свята. Вядома, яно сумнае, бо мы сёння смуткуем па тых людзях, якія загінулі за свабоду, незалежнасць нашай краіны; па тых, хто загінуў у агні, горане вайны. Але разам з тым гэта свята жыццесцвярджальнае, урачыстае. Сёння прайшоў парад, адбыліся ўрачыстасці каля стэлы «Мінск — горад-герой», выступленне кіраўніка дзяржавы. Тысячы гараджан, гасцей сталіцы прыйшлі на гэта свята», — адзначыў Ігар Сергеенка.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў увагу на тое, што ў сям'і кожнага жыхара краіны ў той ці іншай ступені ёсць знак вайны. «У кагосьці не вярнуўся з вайны бацька, сын. Загінулі цэлыя сем'і, партызанскія атрады. На шчасце, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны жывуць, мы сёння бачылі, што яны прысутнічалі на свяце. Выдатна, што адгукнулася наша моладзь, студэнты многіх ВНУ, прыехалі людзі з рэгіёнаў», — сказаў ён.

## КВЕТКІ ЎШАНАВАННЯ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас падчас Акцыі «Беларусь памятае. Памятаем кожнага» разам з жонкай Жанай Румас усклаў кветкі да абеліска на 9-м кіламетры Маскоўскай шашы ў Мінску. Пра гэта паведамляе прэс-служба Савета Міністраў.**



Абеліск усталяваны на месцы пахавання 30 тысяч савецкіх ваеннапалонных, партызан і мірных грамадзян, якія былі расстраляныя і закатаваныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1943 гадах.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## НЕ ЗАБЫВАЦЬ МІНУЛАЕ, СТВАРАЦЬ БУДУЧЫНЮ

**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК разам з супрацоўнікамі міністэрства ўсклаў кошык з 75 жывымі чырвонымі ружамі да стэлы «Мінск — горад-герой», аддаўшы даніну памяці тым, хто ахвяраваў жыццём, абараняючы і вызваляючы Беларусь.**

— Калектыў Мінпрыроды бярэ самы актыўны ўдзел у святкаванні Вялікай Перамогі па ўсёй краіне, — расказаў Андрэй Худык. — І гэта самае малое, што мы можам зрабіць для тых пакаленняў, што падарылі нам магчымасць жыць, ствараць і будаваць будучыню. Такія патрыятычныя мерапрыемствы даюць упэўненасць, што памяць пра подзвіг беларускага народа ў той вялікай вайне будзе навечна ў сэрцах беларусаў. Захоўваючы памяць, мы больш не дапусцім, каб гэта паўтарылася на нашай зямлі.



У гады ваеннага ліхалецця кавалі перамогу дапамагала і родная прырода, упэўнены міністр. Балоты і лясы, рэкі і азёры станавіліся непрыступнымі і цяжкапераадольнымі перашкодамі для ворагаў, у той жа час — родным домам і крыніцай сілы для партызан і баявых часцей арміі. І берагчы прыроду, захоўваць яе для будучых пакаленняў — сёння адна з найважнейшых мірных задач.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

# пройдуць у Беларусі 9 жніўня

## на пазачарговым пасяджэнні другой сесіі

у цалкам асаблівых умовах і вельмі рэзка адрозніваецца ў гэтым плане ад тых кампаній па выбарах Прэзідэнта, якія адбываліся раней».

Сёлетняя выбарчая кампанія ў нацыянальнай валюце будзе каштаваць больш, чым папярэдняя, праінфармавала старшыня ЦВК, але ў доларавым эквіваленце — менш.

На 2020 год у бюджэце закладзена сума на два туры выбараў — 36 мільёнаў беларускіх рублёў. На першы тур выбараў запланаваная сума сёлета — 25 мільёнаў, на другі тур — 11 мільёнаў рублёў.

Сёлетняя выбарчая кампанія пачынаецца вельмі інтэнсіўна. Ужо на гэтым тыдні, 15 мая, апошні тэрмін падачы заяў патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы. Збор подпісаў пачнецца 21 мая і завершыцца 19 чэрвеня.

Профільная камісія, якая прадставіла заяву старшыні ЦВК калегам, пагадзілася з тым, што 9 жніўня — аптымальная дата для галасавання.

«Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца выключна важнай палітычнай падзеяй у жыцці нашай краіны, якая вызначае якасць і кірунак сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы на найбліжэйшыя пяць гадоў, — сказаў **старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін СЕМЯНЯКА.** — Таму пры вызначэнні даты выбараў мы зыходзілі з таго, каб у межах часовага інтэрвалу, які прадугледжаны Асноўным Законам, правесці ў поўнай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам выбарчую кампанію ў максімальна зручны для рэалізацыі ўсіх электаральных этапаў і працэдур час, а таксама забяспечыць максімальны ўдзел грамадзян у выбарах».

«Дата павінна так упісацца ў рытм нашага жыцця, каб, з аднаго боку, дазволіць правесці паўнавартасную выбарчую кампанію і даць магчымасць прыняць узважанае рашэнне кожнаму грамадзяніну, а з іншага боку — забяспечыць паўнавартаснае, нармальнае паўсядзённае жыццё грамадства з улікам сезона і функцыянавання інстытутаў дзяржаўнай улады ў гэты перыяд, — падтрымала **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ.** — Як юрыст і старшыня Камісіі лічу, што дата 9 жніўня адпавядае нормам Канстытуцыі і выбарчага заканадаўства... Гэта дата апраўданая і з пункту гледжання найбольш зручнага часу для выбаршчыкаў. Як выкладчык і як маці ведаю, што другая палова жніўня — традыцыйны час вяртання дашкалят у дзіцячыя садкі, актыўнай падрыхтоўкі школьнікаў да новага навучальнага года, час прыезду студэнтаў да месца навучання, час, калі вырашаецца маса пытанняў, у тым ліку засялення ў інтэрнаты, і цэлы шэраг іншых момантаў, якія маюць значэнне на ўвесь наступны год у жыцці кожнай сям'і. Таму прызначэнне выбараў менавіта на 9 жніўня, на мой погляд, дазволіць правесці паўнавартасную выбарчую кампанію, дасць магчымасць выбаршчыкам прыняць узважанае рашэнне, а потым засяродзіцца на сваіх побытавых, але вельмі важных пытаннях».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# СВЯТА

## Памяць — загінулым,


Брэст.

**ДЗЕНЬ Перамогі адсвяткавалі ва ўсіх населеных пунктах краіны: традыцыйныя ўскладанні кветак да мемарыялаў і абеліскаў загінулым героям і новыя фарматы свята — анлайн-марафон у прамым эфіры, флэшмоб для ветэранаў і персанальныя парады. Як у рэгіёнах сустрэлі 75-годдзе Вялікай Перамогі — у аглядзе нашых уласных карэспандэнтаў.**

### Брэстчына

У Брэсце свята адзначылі ўскладаннем кветак і ўшанаваннем памяці. Брэсцкая крэпасць упершыню за шмат гадоў не стала цэнтрам шматтысячнага мерапрыемства — масавае святкаванне перанеслі на пазнейшы тэрмін. А ў Дзень Перамогі да Вечнага агню ўсклалі кветкі як сімвал удзячнасці нашчадкаў за гераізм і пакуты той вайны.

Ветэранаў павіншавалі загадзя. Ім уручылі юбілейныя медалі і падарункі. А ў крэпасці даніну павагі абаронцам Радзімы аддалі кіраўнікі вобласці і горада, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Старшыня аблвыканкама Анатоль ЛІС адзначыў, што Дзень Перамогі на Брэстчыне святкуюць у кожным райцэнтры, пасёлку, кожнай вёсцы: «Гэта наша традыцыя, мы ёй не здраджваем».

Прыблізна ў такім жа фармаце прайшлі святы ў райцэнтрах вобласці. У сельскай мясцовасці кветкі былі ўскладзены да падножжаў абеліскаў і на брацкія магілы загінулых. У аграгарадку Павіцце Кобрынскага раёна ўрачыста ўсклалі кветкі да помніка маці, якая смуткуе, і да ўсіх абеліскаў, якія ёсць на тэрыторыі. У Камсамольскім скверы Бярозы кветкі і вянкі леглі на брацкую магілу воінаў і партызан. У Давыд-Гарадку Столінскага раёна вянкі ўсклалі да помніка воіну-вызваліцелю. Гэты помнік асаблівы. Шмат гадоў ён з'яўляўся сімвалам горада, а ў 2000-м быў дэманціраваны, бо прыйшоў у заняпад. Але з цягам часу мемарыял змаглі аднавіць з дапамогай прадпрыемстваў і арганізацый горада, і напярэдадні свята вызваліцель заняў сваё ранейшае пачэснае месца.

### Віцебшчына

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ, выступаючы на мітынгу на мемарыяле «Рыленкі» ў Дубровенскім раёне, адзначыў, што да свята зрабілі рамонт, рэканструкцыю, добраўпарадкаванне тэрыторыі прыблізна 1,5 тысячы месцаў памяці. І самыя маштабныя работы на працягу двух гадоў праводзілі ў «Рыленках».

Гэтыя аб'екты — даніна павагі тым, хто ваяваў з нямецка-фашысцкімі акупантамі. У час падрыхтоўкі да святкавання прывялі ў парадак шмат аб'ектаў, адкрылі і новыя. Напрыклад, у Гарадоцкім раёне цяпер ёсць алея, прысвечаная Героям Савецкага Саюза, якія нарадзіліся тут.

І канешне, галоўнае, па-ранейшаму, — клопат пра ветэранаў. Губернатар падкрэсліў, што землякі павінны зрабіць усё магчымае, каб тыя былі забяспечаны ўсім неабходным і жылі як мага даўжэй. Многія ветэраны асабіста паказваюць прыклад здаровага спосабу жыцця, актыўнасці і аптымізму. Іх словы, парады, мудрасць — вельмі каштоўныя. Ветэраны ВАВ — прыклад мужнасці, падкрэсліў губернатар.

У Прыдзвінні ўсё больш крэатыўна святкуюць Дзень Перамогі. Трэнд часу — віншаванні, канцэртныя праграмы, перформансы ў інтэрнэце.


Віцебск.

У прыватнасці, Цэнтр культуры «Віцебск» пры падтрымцы абкама БРСМ правёў анлайн-марафон «75 ДЗЯКУЙ!». 75 кранальных гісторый, 75 светлых сустрэч, 75 душэўных віншаванняў, 75 шчырых падзяк адбыліся ў адным прамым эфіры!

Нават у глыбінцы арганізавалі канцэрты, святочныя імпрэзы, тэматычныя квэсты для дзяцей і дарослых.

### Гомельшчына

У рэгіёне прайшлі ўрачыстыя мітынгі, да помнікаў і брацкіх пахаванняў ускладалі кветкі, ветэраны прымалі персанальныя парады: пад вокнамі герояў салютавалі маладыя вайскоўцы. Гучалі словы бясконцай удзячнасці і музычныя віншаванні.

Святкаванне Дня Перамогі ў Гомелі распачалі мітынгам каля Вечнага агню і брацкай магілы савецкіх воінаў і падпольшчыкаў. Урачыстае мерапрыемства адкрыў старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.

— Дарагія ветэраны, вы здзейснілі вялікі подзвіг вызвалення. Дзякуй за тое, што і сёння вы з'яўляецеся нашай надзейнай духоўнай апорай, — звярнуўся ён са словамі ўдзячнасці на адрас герояў, адзначыўшы: — У Гомельскай вобласці штогод рамантуюць і аднаўляюць воінскія пахаванні. Пастаянна ідзе пошукавая работа. Толькі летась на мемарыяльныя дошкі нанесена больш за 4 тысячы высветленых імёнаў герояў, што загінулі на тэрыторыі рэгіёна.

Старшыня аблвыканкама нагадаў пра тое, што цяпер рыхтуецца да адкрыцця сапраўды народны патрыятычны праект — мемарыяльны комплекс на месцы спаленай вёскі Ала ў Светлагорскім раёне. Прыкладам захавання памяці пра подзвіг легендарнага гомельскага партызана і падпольшчыка Емяльяна Барыкіна стаў партрэт Героя Савецкага Саюза, які цяпер з'явіўся на фасадзе аднаго з жылых шматпавярховых дамоў Гомеля.

Між тым напярэдадні Дня Перамогі ў абласным цэнтры ўрачысты мітынг прайшоў на Алеі Герояў. Тут пахаваны 135 удзельнікаў абароны Гомеля 1941 года, партызаны і падпольшчыкі, а таксама салдаты і афіцэры Чырвонай Арміі, якія вызвалялі горад у 1943 годзе.

— Мы адзначаем важную для кожнага грамадзяніна дату і зноў усведамляем яе высокую значнасць, ганарымся тым, што нашы дзяды і прадзеды змаглі знішчыць «карычневую чуму», — падкрэсліў падчас мітынгу старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр КІРЫЧЭНКА.

Увечары 8 мая на Алеі Герояў актывісты БРСМ выклалі запаленымі лампадкамі лічбу 75 як сімвал памяці пра тых, хто ваяваў за мір для будучых пакаленняў.

Гамяльчане аддалі даніну памяці героям каля Кургана Славы. 15 гадоў запар тут праходзіць акцыя «Беларусь — зямля славы ратнай». Моладзь наведвае месцы баявой славы, а прывезеная адтуль зямля ўносіцца ў курган. За ўвесь час удзельнікамі акцыі стала больш за 14 тысяч чалавек, а зямля сабрана з 350 памятных месцаў.

Акрамя таго, гамяльчане ўшанавалі памяць 1500 рабочых завода «Гомсельмаш», якія ў гады вайны загінулі на фронце, у падполлі, у партызанах.

У Гомельскім раёне ў вёсцы Рудня Целяшоўская пасля маштабнай рэстаўрацыі ўрачыста адкрылі мемарыяльны знак, які вяскоўцы самі ў 70-х гадах мінулага стагоддзя пабудавалі ў гонар пра землякоў — 116 чалавек з чатырох мясцовых вёсак. Спецыялісты філіяла «Гомельскае ўпраўленне магістральных газаправодаў» ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь» правялі маштабнае добраўпарадкаванне месца памяці, апрацавалі помнік сучаснымі матэрыяламі, узмацнілі стэлы, а таксама замянілі пліты з імёнамі загінулых.

У Рэчыцы ў гонар 75-годдзя Вялікай Перамогі супрацоўнікі МНС высадзілі кляновыя алеі — як напамін пра подзвіг салдат Перамогі. Ратавальнікі таксама бралі ўдзел ва ўшанаванні ветэранаў — жыхароў Рэчыцкага раёна.

Кіраўніцтвам Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС быў арганізаваны персанальны парад для ветэранаў Вялікай Айчыннай Івана Насенкі і яго жонкі Таісіі Іванаўны — жыхароў вёскі Церахоўка Добрушскага раёна. Сужэнцы пасля заканчэння вайны і да сыходу на заслужаны адпачынак працавалі ў пажарнай службе. Ветэранаў віталі рота ганаровай варты, аркестр абласнога ўпраўлення МНС і супрацоўнікі ведамства.

Асабістыя парады пад вокнамі сваіх дамоў прымалі ветэраны ў Гомелі, Мазыры, Жлобіне, Светлагорску, Добрушы, Гомельскім, Лельчыцкім, Рэчыцкім раёнах...

Дарэчы, у гэтыя святочныя дні гасцей Гомеля ў цэнтральным будынку чыгуначнага вакзала сустракае макет лакаматыва рэтрацягніка, які стаў сімвалам пераможнага мая 1945-га.


Гомель.

# Ў ХАТУ

## падарункі — жывым

### ❍ Гродзеншчына

Гродзенцы ўзялі ўдзел у мерапрыемствах у гонар 75-й гадавіны Вялікай Перамогі.

У горадзе, які знаходзіцца каля самай заходняй граніцы, першы ўдар ворага прынялі на сябе пагранічнікі. Іх памяць ушанавана велічным мемарыяльным комплексам з цэнтральнай кампазіцыяй «Граніца ў агні». На пастаментах па перыметры мемарыяла — імёны загінулых. Падчас святкавання 75-годдзя Перамогі тут сабраліся ветэраны, прадстаўнікі грамадскасці Гродна і Гродзенскай пагранічнай групы. Пад гукі духавога аркестра яны ўсклалі вянкі і кветкі.



Гродна.

Дарэчы, гукі аркестра разносіліся ў гэтыя святочныя дні і ў гарадскіх дворыках. Спецыяльна для ветэранаў былі арганізаваны міні-парад і канцэрт каля іх дамоў. Гучалі мелодыі песен «Кацюша», «Смуглянка», «Дзень Перамогі». Перад ветэранамі роўным строем прайшлі прадстаўнікі некаторых родаў войск. Ваенныя маршы гучалі ў розных канцах горада — па месцы адрасоў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Песенны флэшмоб прайшоў з удзелам дзяўчат у ваеннай форме. Яны спявалі «Кацюшу» перад балконамі ўдзельнікаў вайны.

Важнай падзеяй святкавання 75-й гадавіны Вялікай Перамогі стала адкрыццё мемарыяльнай дошкі Герою Савецкага Саюза Ільі Антонаву. Аўтар барэльефа — вядомы гродзенскі скульптар, член Саюза мастакоў Беларусі Уладзімір Панцялееў. Мемарыяльная дошка ўсталявана на доме ў цэнтры горада. У Гродне Ілья Антонаў жыў і працаваў пасля дэмабілізацыі, у гады вайны ён быў удзельнікам Сталінградскай і Курскай бітваў. Асабліва вызначыўся падчас бітвы за Днепр у 1943 годзе, за што і атрымаў званне Героя Савецкага Саюза. Многія асабістыя рэчы героя захоўваюцца ў Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, у Гродне яго імем названа адна з самых ажыўленых вуліц горада. У цырымоніі ўзяла ўдзел унучка Ільі Антонава Таццяна, яго знаёмыя, калегі.

### ❍ Магілёўшчына

Флэшмобы, анлайн-спектаклі, інтэрактыўныя выстаўкі, вэб-марафон. І шмат іншых, пераважна анлайнавых мерапрыемстваў прысвяцілі ў Магілёўскай вобласці 75-й гадавіне Перамогі.

Галоўныя святочныя ўрачыстасці, прысвечаныя гэтай даце, прайшлі на плошчы Славы. Да Вечнага агню былі ўскладзены кветкі і вянкі ад прадстаўнікоў выканаўчай і прадстаўнічай улады, ветэранаў, грамадскіх аб'яднанняў, звычайных гараджан, якія палучыліся да свята і палічылі патрэбным наваг у гэтай складанай эпідэміялагічнай абстаноўцы прыйсці, каб аддаць даніну павагі абаронцам і вызваліцелям нашай Радзімы.

— Перамаглі нашы бацькі і дзяды, і мы пераможам, — аптымістычна сказаў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ. — Мы не можам інакш, у нашых жылах цячэ кроў пераможцаў. Вялікі дзякуй нашым ветэранам, усім тым, хто не дажыў да Перамогі, хто паклаў сваё жыццё на алтар Перамогі. Мы будзем шанаваць гэты подзвіг і не выпускаць Перамогу з рук.

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА лічыць свята Перамогі вельмі сакральным і асабістым.

— Не павінна быць перашкод для таго, каб мы — хто разам з таварышамі, а хто і паасобку — прыйшлі да памятнага месца і згадалі тых людзей, якія цаной свайго жыцця адстаялі незалежнасць той вялікай радзімы і нашай Беларусі. Тая вайна стала генацыдам для беларускага народа. І каб не было перакосаў, скажэнняў гістарычнай праўды, мы і абавязаны прыходзіць да памятных месцаў, у тым ліку са сваімі дзецьмі.

Былы марак Анатоль Пятровіч Філіповіч прыйшоў на плошчу Славы разам са сваім унукам Мікітам. У руках яны трымалі партрэты шасці франтавікоў. Згадваючы пра сваіх бацьку і дзеда, капітан трэцяга рангу не мог стрымаць слёз.

— Мы прыйшлі таму, што гэта іх свята, і з намі прыйшлі на яго і яны, — коратка растлумачыў ён. — Двое з іх так і не вярнуліся з фронту. Па кожным з іх баліць сэрца.



Мінск.

Не засталася дома і былы вязень адразу некалькіх канцлагераў: Майданека, Равесбрука, Алітуса Ала Васілеўна Круглікава. Уся яе сям'я загінула на вайне, толькі яна адна цудам засталася жывая.

— Гэта было сапраўднае пекла, — згадвае яна гады ваеннага ліхалецця. — І толькі дзякуючы воінам-вызваліцелям я жыву.

У гарадской ратушы ў гэты дзень адбылася сустрэча з удзельнікам абароны Магілёва Андрэем Цімафеевічам Андрэйчыкавым. Ён быў прызваны ў войска ў ліпені 1944 года, а адтуль накіраваны на фронт. Навіна аб Перамозе знайшла яго ў шпіталі ў польскім горадзе Чэнстахове, дзе ён знаходзіўся пасля ранення. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі». Ветэрана асабіста павіншаваў мэр горада Уладзімір Цумараў.

У рамках акцыі «Беларусь памятае. Памятаем кожнага!» з 5 да 9 мая ў Магілёве і Бабруйску, а таксама райцэнтрах вобласці праходзілі ўскладанні кветак і вянкоў да воінскіх пахаванняў і мемарыяльных комплексаў. Праз напружаную эпідэмічную абстаноўку святочныя мерапрыемствы ў Магілёўскай вобласці адбываліся ў асноўным у анлайн-фармаце.

### ❍ Міншчына

Дэлегацыя Мінскай вобласці ўзяла ўдзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных 75-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН, памочнік Прэзідэнта Беларусі — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ і намеснік кіраўніка цэнтральнага рэгіёна Іван МАРКЕВІЧ усклалі кветкі да мемарыяльнага комплексу «Курган Славы». А старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая і старшыня Смалявіцкага райвыканкама Андрэй Ратомскі — да помніка савецкім воінам-вызваліцелям у горадзе Смалявічы. Не засталіся забытыя і ахвяры спаленых вёсак Хатынь і Дальва ў Лагойскім раёне. Да аднайменных мемарыяльных комплексаў, узведзеных у гонар загінулых, таксама былі ўскладзены кветкі.

З-за супрацьэпідэмічных мер у рэгіёнах Міншчыны адмовіліся ад шырокай святочнай праграмы. Разам з тым у кожным раёне і горадзе Жодзіне ўшанавалі памяць загінулых воінаў, партызан, мірных жыхароў. Да брацкіх магіл, помнікаў, абеліскаў удзячныя нашчадкі прынеслі кветкі і вянкі, а таксама павіншавалі ветэранаў Вялікай Айчыннай паштоўкамі, падарункамі, дамашнімі канцэртамі.

З нагоды Дня Перамогі ў школах, музеях, установах культуры Міншчыны зладжаны выстаўкі, прысвечаныя ваеннаму ліхалеццю. Напрыклад, у гісторыка-этнаграфічным музеі Слуцкага дзяржаўнага каледжа сабралі ўнікальную калекцыю ваенных фотаздымкаў горада. Многія здымкі — рэдкасць, іх няма ні ў адным музеі Беларусі. Яны значна папоўнілі экспазіцыю і цалкам аднавілі карціну баявых дзеянняў на Случчыне. У Капылі каля раённага Дома культуры працуе выстаўка з фота ваенных гадоў, а на цэнтральнай плошчы ідзе радыёканцэрт, дзе гучаць мелодыі ваеннага часу.

Ну і вядома, якое свята без падарункаў усім жыхарам вобласці! Напярэдадні Дня Перамогі ў вёсцы Бараўляны Мінскага раёна ўрачыста адкрыўся дзіцячы сад на 230 месцаў. У цырымоніі ўзяў удзел старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын.

У Астрашыцкім Гарадку Мінскага раёна напярэдадні свята адбыліся адразу дзве значныя падзеі. Першая з іх — адкрыццё дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў «Камфортнае жыццё», разлічанага на 65 месцаў, у тым ліку 5 — для калясачнікаў. Размясціўся ён у экалагічна чыстай зоне — у атачэнні сасновага бору, побач з возерам. Будучыя пастаяльцы будуць жыць у адна- і двухпакаёвых нумарах з усімі зручнасцямі. На першым паверсе — пакоі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Акрамя таго, у населеным пункце ўрачыста адкрылі памятны знак і сквер да 75-годдзя Вялікай Перамогі. Быў распрацаваны план сквера, падабраны расліны і складзены з іх кампазіцыі, якія сімвалізуюць памяць і жалобу жывых па загінулых. Такімі сімваламі сталі бярозы і сосны. На ўсёй тэрыторыі сквера высаджана 12 кампазіцый, якія складаюцца з дзвюх бяроз — сімвала жывых — і адной сасны ў памяць кожнага трэцяга беларуса, які загінуў у вайне.

У аграгарадку Слабада Смалявіцкага раёна ўведзены ў эксплуатацыю 12-кватэрны жылы дом для работнікаў сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Першамайскі». Гэты дом для работнікаў свайго філіяла пабудаваў БелАЗ. У 2019 годзе гаспадарка дасягнула высокіх вынікаў у раслінаводстве. А нядаўна тут была ўведзена ў дзеянне новая малочнатаварная ферма. Менавіта для яе работнікоў і прызначана новае камфортнае жыллё з сучаснай інфраструктурай. На прылеглай тэрыторыі прадугледжаны зручныя пешаходныя дарожкі, паркоўкі для аўтатранспарту, гаспадарчыя, дзіцячыя пляцоўкі з гульнявым абсталяваннем, малымі архітэктурнымі формамі.



Магілёў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**Фота БелТА.**



**СВЯТА Перамогі, якое адзначалася трыццаць адзін год таму, я сустрэў у Магілёўскім раёне. Мой маршрут у гэты шчымліва-светлы дзень пралягаў у вёску Дубінка Вендаражскага сельсавета. Там, на краі населенага пункта, знаходзіцца магіла, у якой пахаваныя жыхары вёскі, спаленыя ў лютым 1943 года разам са сваім паселішчам. І кожны год дзявятага мая каля помніка магілёўскай Хатыні збіраюцца сотні людзей, каб ускласці кветкі і вянкі, паслухаць нашчадкаў — сённяшніх жыхароў вёскі-пакутніцы, якая насуперак лёсу адрадзілася і жыве.**

Я тады невыпадкова прыехаў у Дубінку: ведаў, што сярод удзельнікаў вайны сустрэну і тых, чые грудзі ўпрыгожаны трыма зоркамі, — поўных кавалераў ордэна Славы. На той час у раёне засталіся тры доблесныя франтавікі, якіх Айчына ўганаравала такім высокім званнем, — Сяргей Сотнікаў, Міхаіл Сафонаў і Сяргей Лупікаў. Менавіта пад Магілёвам мне пашчасціла не толькі ўбачыць, але і сфатаграфаваць разам салдат вайны, подзвіг якіх прыраўноўваецца да подзвігу Герояў Савецкага Саюза. І цяпер, як і ў той час, не хаваю гонару, што ў маім фотаархіве ёсць такі здымак.

Яшчэ да паездкі ў Дубінку мне ўжо былі вядомыя гэтыя зоркавыя ветэраны — аднойчы з кожным з іх я рабіў партрэтную, як цяпер кажуць, фотасесію. На пачатку 1988-га мой фотаархіў папоўніўся партрэтам Сяргея Лупікава. Мы сустрэліся з кавалерам у яго кватэры. Памятаю, як адчыніў дзверы статны, усмешлівы, з добрым поглядам мужчына — на той час Сяргею Агафонавічу ішоў толькі шэсцьдзясят сёмы год. За яго плячыма была вялікая біяграфія цяжкай вайны і мірнай працы на магілёўскіх будоўлях у якасці цесляра, сталяра, плітачніка. Перад тым як пачаць здымкі, я слухаў яго аповеды.

— Калі мы пайшлі ў наступленне ад ракі Проні на Захад, не было ніводнага дня без бою. Людзі гінулі хутка. Поўны склад дывізіі — шэсць-сем тысяч армейцаў, а назаўтра ўжо толькі трыста чалавек, — згадваў ветэран. — Мне пашэнціла вярнуцца з вайны дадому, хоць пяць разоў быў паранены. А вось маім дзядзькам і стрыечным братам не пашчасціла ацалець — дзесяць душ з нашай радні забрала вайна.

Да Сяргея Сотнікава я паехаў у вёску Старына. Быў пачатак вясны, на адзінай вясковай вуліцы яшчэ заставаліся плямы апошняга снегу. Прыгадваю сустрэчу ў сялянскай хаце, няспешныя размовы і, вядома, здымкі.

— Да вайны ў нашай вёсцы было пятнаццаць хат, а сёння — толькі дзевяць жылых падворкаў, — казаў Сяргей Трыфанавіч, калі мы ішлі да агульнавясковай студні. — Болей за дваццаць мужчын не вярнулася з вайны — такая доля ў нашай вёскі...

Ветэран прыгадаў, што калгас, у якім ён працаваў перад вайной, называўся сімвалічна — «Перамога». Дарэчы, студня, каля якой прысеў славуты вясковец, была выкапана таксама перад нямецкай акупацыяй.

— Часта пасля бою прыгадваў нашу студню і яе смачную вадзіцу, — успомніў такую частку сваёй асабістай вайны Сяргей Трыфанавіч Сотнікаў.

Поўны кавалер Міхаіл Сафонаў жыў у прыгарадным пасёлку Магілёва — Казіміраўцы. У яго быў свой дом, прысядзібны двор. Ён ужо быў дзедам, і маленькія ўнучкі-школьніцы часта прыбягалі да Міхаіла Фролавіча пагуляць, пачаставацца ласункамі, якія заўсёды былі ў яго кішэні. І першы раз, калі я наведаўся да франтавіка, здымаў яго ў кампаніі з унучкамі. Другім разам наша сустрэча адбылася на веснавой вясковай вуліцы, калі ветэран рушыў на свята Перамогі. Пра свае франтавыя подзвігі салдат-разведчык не любіў згадваць — магчыма, не хацеў трывожыць старыя раны і даўнюю памяць пра апаленую маладосць: у сорак пятым герою было толькі дваццаць гадоў.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

## Сяргей СОТНІКАЎ

Сяргей Трыфанавіч Сотнікаў нарадзіўся ў 1920 годзе ў вёсцы Батунь, што знаходзілася ў Быхаўскім раёне. Скончыў няпоўную сярэднюю школу і з 16 гадоў шчыраваў у мясцовым калгасе. Павестку аб прызыве на тэрміновую службу атрымаў толькі ў верасні 1940 года. На фронт трапіў літаральна ў першыя дні Вялікай Айчыннай. Але павяваць яму доўга не давялося. Радавы Сотнікаў разам са сваім падраздзяленнем трапіў у акружэнне, але здолеў выйсці да роднай вёскі. Папрацаваўшы нейкі час у хатняй гаспадарцы, вырашыў далучыцца да партызан.

Бялыніцкі райваенкамат прызваў Сяргея Сотнікава яшчэ раз у войска ў ліпені 1944 года. Трапіў хлопец у 433-і стралковы полк 64-й стралковай Магілёўскай дывізіі 33-й арміі 1-га Беларускага фронту. З 7 жніўня полк знаходзіўся на перадавой.

І ўжо літаральна праз дзевяць дзён стралок Сяргей Сотнікаў заслужыў ордэн Славы III ступені. На заключным этапе Беларускай наступальнай аперацыі яго полк змагаўся з немцамі за плацдарм на заходнім беразе ракі Нарэў на тэрыторыі тагачаснай Беластоцкай вобласці. 16 жніўня 1944 года зацятыя баі ішлі каля вёскі Акрасін, якая цяпер уваходзіць у склад Граеўскага павета Падляскага ваяводства Польшчы. Падчас наступу Сяргей Трыфанавіч адзін з першых праравўся ў нямецкую траншэю. Прыцэльным агнём зараз жа «зняў» кулямётчыка. Немцы спрабавалі адбіць траншэю назад. Тут стралок Сотнікаў пайшоў на хітрасць. Ён вёўназіранне за варожай пяхотай, пакуль тая не падабралася на адлегласць кідка рукой. І як толькі гэта адбылося, у ворага адна за другой паляцелі гранаты. 13 гітлераўцаў засталіся ляжаць забітымі. За гэты подзвіг чырвонаармеец Сяргей Сотнікаў і атрымаў першую высокую ўзнагароду.

...У пачатку 1945 года савецкія войскі падчас Вісла-Одэрскай стратэгічнай аперацыі шчыльна падышлі да ракі Одэр, за якой пачыналася тэрыторыя Германіі. Немцы аказвалі вельмі жорсткі супраціў, асабліва калі трапляялі ў акружэнне. Так здарылася і каля вёскі Струга Кросненскага павета Любускага ваяводства на паўночным захадзе Польшчы. Наш герой ужо атрымаў званне малодшага сяржанта, ён служыў у той жа дывізіі санінструктарам, але ў баях за вёску Струга знаходзіўся ў баявых парадках пяхоты. Ледзь толькі акружаныя немцы перайшлі ў чарговую контратаку, як па іх ударыў з фланга прыцэльны аўтаматны агонь. Дзесяць фашыстаў былі забіты на месцы. Яшчэ васямнаццаць паспрабавалі ўцячы ў бліжэйшы лес. Ды не тут было — малодшы сяржант Сотнікаў захапіў іх у палон разам з усім узбраеннем. Камандаванне ацаніла гэты ўчынак прадстаўленнем да ордэна Славы II ступені.

На заключным этапе вайны стралковая дывізія, у якой служыў Сяргей Сотнікаў, удзельнічала ў Берлінскай наступальнай аперацыі. З 16 да 19 красавіка 1945 года зацятыя баі ішлі на подступах да горада Франкфурт-на-Одэры. Пад няспынным агнём ворага санінструктар Сотнікаў вынягнуў з поля бою 60 параненых воінаў. Калі з 30 красавіка да 2 мая ішлі баі за Берлін, то ён аказаў дапамогу 15 параненым салдатам і эвакуіраваў іх у бяспечнае месца. За гэтыя заслугі яго праз год узнагародзілі ордэнам Славы I ступені.

Пасля вайны Сяргей Сотнікаў атрымаў прафесійную адукацыю. Працаваў інжынерам па тэхніцы бяспекі ў саўгасе «Барок», які месціўся ў вёсцы Заводская Слабада Магілёўскага раёна. За год да смерці, у 1999 годзе, атрымаў узнагароду «За службу Радзіме».

Памяць аб ім жыве і сёння. Адкрыты абласны турнір па вольнай барацьбе носіць менавіта яго імя — поўнага кавалера ордэна Славы. Таксама ён удзельнічаў у здымках кінастужкі «Ішоў салдат...», знятай у 1975-м да 30-годдзя Перамогі.





# ПРОСТЫЯ ХЛОПЦЫ З МАГІЛЁЎШЧЫНЫ



## Міхаіл САФОНАЎ

Міхаіл Фролавіч Сафонаў нарадзіўся 10 студзеня 1925 года. Бацькі яго былі сяляне, жыла сям'я ў вёсцы Шастакі тагачаснага Горацкага раёна. Адразу пасля пачатку вайны прызваць хлопца ў войска не маглі — яму было ўсяго толькі 16 поўных гадоў. Два гады Міхаіл Фролавіч правёў пад нямецкай акупацыяй, а ў кастрычніку 1943-га сышоў у партызаны. Там і ваяваў да ліпеня 1944-га. А пасля быў прызваны ў дзеючую армію. Юнак стаў разведчыкам у 374-й асобнай разведроце 290-й стралковай дывізіі 3-й арміі 2-га Беларускага фронту.

...У верасні 1944-га рота дзейнічала ў раёне ракі Нарэў на поўдзень ад польскага горада Астраленка. Знаходзячыся ў групе пошуку, Міхаіл Сафонаў употай падабраўся да нямецкага агнявога пункта і захапіў чужога вайскоўца. «Язык» паведаміў вельмі каштоўныя звесткі пра абарону гітлераўцаў. Гэта стала нагодай для таго, каб узнагародзіць 19-гадовага хлопца ордэнам Славы III ступені.

Студзень 1945-га Міхаіл Сафонаў сустрэў на цяперашнім паўночным усходзе Польшчы. Там ішоў марудны, цяжкі наступ на Усходнюю Прусію. Працяглы час фронт стаяў каля горада Лідзбарк-Варміньскі. Міхаіл Сафонаў падчас аднаго з разведвальных рэйдаў знішчыў дванаццаць нямецкіх салдат і афіцэраў. А назад да сваіх вярнуўся з добрым «уловам» — ручным кулямётам і дзясяткам аўтаматаў. Камандаванне дывізіі ацаніла гэты ўчынак прадстаўленнем да ордэна Славы II ступені.

У канцы красавіка 1945 года ішлі зацятыя баі за Берлін. Падраздзяленне, у якім служыў Міхаіл Сафонаў, дзейнічала на паўднёвы ўсход ад сталіцы рэйха. 30 красавіка яно атрымала задачу — знішчыць узброеную групоўку праціўніка. Падчас яе выканання 20-гадовы юнак уварваўся ў адно з размяшчэнняў і адкрыў з аўтамата прыцэльны агонь. Трынаццаць гітлераўцаў палеглі пад яго кулямі. Яшчэ дзевяцярых разам з іншымі салдатамі ён даставіў у сваё размяшчэнне.

Праўда, Міхаіл Сафонаў быў прадстаўлены да ордэна Славы I ступені толькі пасля вайны — камандуючы 3-й арміяй генерал Аляксандр Гарбатаў падпісаў адпаведны дакумент 19 мая 1945-га. Пачэсная ўзнагарода знайшла свайго героя праз год.

Старшына Сафонаў дэмабілізаваўся з войска толькі ў 1948-м. Вярнуўся ў Беларусь. Доўгі час жыў у Магілёве, дзе працаваў на адным з заводаў. Памёр ён 17 ліпеня 1996 года.



## Сяргей ЛУПІКАЎ

Ён нарадзіўся ў кастрычніку 1923 года ў вёсцы Бяседавічы Хоцімскага раёна. Яго бацькі былі сялянамі; пасля заканчэння школы Сяргей Агафонавіч таксама пайшоў працаваць у мясцовы калгас. Амаль два гады правёў пад нямецкай акупацыяй.

Вайсковы шлях Сяргея Лупікава пачаўся ў 20 гадоў — у кастрычніку 1943 года, калі Чырвоная Армія вызваліла Хоцімшчыну. Ваяваў ён у складзе 1223-га стралковага палка 369-й стралковай дывізіі 50-й арміі ў складзе 2-га Беларускага фронту.

...Свой першы ордэн Славы III ступені ён здабыў ужо падчас баёў на тэрыторыі Польшчы. У жніўні 1944 года лінія фронту праходзіла ўжо крыху на захад ад Беластока. У той час сяржант Лупікаў камандаваў аддзяленнем узвода пешай разведкі. Ён атрымаў заданне разведаць агнявую сістэму праціўніка паблізу вёскі Асавец. З ім аддзяленне справілася на «выдатна». Больш за тое, назад салдаты вярнуліся з сямю палоннымі немцамі, яшчэ чатыры былі забіты падчас уварвання ў траншэю.

У лютым 1945 года зацятыя бай ішлі на напрамку Лодзь—Гданьск. Камандаванне арміі паставіла задачу — авалодаць вёскай Альтхаўзен. Бой за яе ішоў ажно тры дні. Падчас адной з перастрэлак моцна параніла камандзіра ўзвода. Яго замяніў сяржант Лупікаў. Немцы панеслі адчувальны ўрон — было знішчана каля трох дзясяткаў гітлераўцаў. Яшчэ 172 здаліся ў палон. Сярод іх былі і афіцэры. Узвод здолеў вывесці са строю 2 гарматы і 4 кулямёты. Загадам па 70-й арміі Сяргей Лупікаў быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступені.

Разам са сваім узводам сяржант вельмі адзначыўся падчас узяцця польскага горада Гдыні. У ноч на 27 сакавіка 1945 года яны разведалі чатыры пераправы цераз раку Ісача, дзякуючы якім савецкія часці змаглі ўвайсці ў населены пункт. Больш за тое, яго ўзвод захапіў авіяцыйны завод, знішчыў трыццаць аднаго і ўзяў у палон паўсотні немцаў. Гэтыя ўчынкі сталі падставай для прадстаўлення сяржанта Лупікава Сяргея Агафонавіча да ордэна Славы I ступені. Дакумент падпісаў камандуючы 2-м Беларускім фронтам Маршал Савецкага Саюза Канстанцін Ракасоўскі. Поўным кавалерам ордэна Славы Сяргей Лупікаў стаў ужо пасля Перамогі — 29 чэрвеня 1945 года.

Пасля вайны ён доўгі час жыў і працаваў у Магілёве, у адным з будаўнічых трэстаў. Памёр 31 сакавіка 1995 года.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. Анатоль КЛЯШЧУК *(фота)*.

Ігар БУЗОЎСКІ:

# «ЗАХАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ — НЕКАМЕРЦЫЙНЫ ПРАЕКТ»

**Сёлета да 75-га Дня Перамогі рэалізаваны і працягваецца шэраг выдавецкіх праектаў, убачылі свет дзясяткі новых і перавыдадзеных кніг — навукова-папулярных, публіцыстычных, мастацкіх. Але гэта, заўважае намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ, толькі вяршыня айсберга, вынік, бачны кожнаму. Знутры ж — вялізная сістэмная работа на дзяржаўным узроўні.**


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Я вылучыў бы два блокі, якія з'яўляюцца значнымі ў стратэгіі развіцця кнігавыдання і кнігараспаўсюджвання і рэалізуюцца, у прыватнасці, Міністэрствам інфармацыі. Перадусім гэта садзейнічанне асяроддзю пісьменнікаў, стварэнне ўмоў для падрыхтоўкі і выпуску выданняў на тэмы, асабліва важныя для нашай дзяржавы, — натуральна, сёння ў іх ліку 75-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Такія праекты некамерцыйныя, таму яны патрабуюць як нематэрыяльнай падтрымкі, так і пэўных фінансавых укладанняў з боку дзяржавы, бо маюць сваёй задачай фарміраванне нацыянальнага менталітэту, тых маральных каштоўнасцяў і асноў грамадства, на якіх, уласна, і трымаецца дзяржава.

Работа з камерцыйным бокам справы, з камерцыйнымі выдавецтвамі, якім час дыктуе эканоміку, што патрабуе часам базіравацца на нечым гарачым, на модным сёння слоўцы «хайп», заключаецца ў тым, каб садзейнічаць гістарычнай праўдзе, памяці аб гераічным мінулым продкаў, нашай Радзімы. Наша задача — каардынацыя гэтага кірунку, падтрымка выдавецкіх калектываў, якія вызначаюцца прафесійным падыходам да фактаў, лічбаў, дакументаў, якія могуць адэкватна ацаніць новыя звесткі, што з'яўляюцца на інфармацыйным полі, адкрыць новыя грані вядомых гістарычных падзей і падрыхтаваць новыя кнігі, якія будуць запатрабаваныя ў сучаснікаў. Гэта задача глабальная і вельмі важная акурат з той прычыны, што яна не мае камерцыйнага вымярэння, але мае сацыяльную значнасць. Сацыяльна значную літаратуру, сур'ёзныя, глыбокія даследчыцкія праекты заўжды падтрымліваюць і Міністэрства інфармацыі, і іншыя ведамствы і арганізацыі. Хочацца асобна згадаць работу выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» — кніжныя серыі «Беларусь памятае: у імя жыцця і міру», «Беларусь: трагедыя і праўда памяці» і іншыя. Наколькі яны будуць запатрабаваныя ў масіве кніг, што цяпер выдаюцца, — час пакажа. Але гэта насамрэч глыбокая, каласальная праца, праведзеная сур'ёзнымі навукоўцамі, прычым, паўтаруся, праца, якая была б немагчымая без падтрымкі дзяржавы. Таму вельмі прыемна адзначыць, што спрыянне такім праектам — гэта і наш унёсак у захаванне гістарычнай памяці, ушанаванне вялікага подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

***— Але як дамагчыся, каб нават вельмі добрыя, цікавыя і карысныя кнігі не згубіліся, як вы кажаце, у масіве літаратуры, а былі заўважаныя чытачом?***

— Тут неабходна вызначыць другі блок работы: суправаджэнне. Прычым не проста кніг ці асобна ўзятых праектаў, а адпаведнай тэматыкі наогул. Так, выставачны праект «Вайна і мір», які стартаваў яшчэ ў лютым, дазволіў звярнуць увагу чытацкай аўдыторыі не толькі Беларусі, але і блізкага і далёкага замежжа на тэму вайны ў шырокім сэнсе — бо Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне не стваралася толькі з 1941 да 1945 года, а была абумоўленая адпаведным ідэалагічным, патрыятычным выхаваннем, духам народа-пераможцы, які заклалі бацькі, дзеды і прадзеды герояў — удзельнікі Айчыннай вайны 1812 года і Першай сусветнай. Такі падыход, на наш погляд, дапамагае зірнуць па-іншаму на вядомыя гістарычныя падзеі і зацікавіць самыя шырокія колы — ад прафесійных гісторыкаў да турыстаў, якія зазірнулі ў музей. Фіналам праекта мусіць стаць аповед менавіта пра 9 Мая — Дзень Перамогі, які паставіў кропку ў гісторыі кровапралітных войнаў на нашай зямлі. У няпростай эпідэміялагічнай сітуацыі, якая цяпер склалася, безумоўна, даводзіцца ўносіць карэктывы ў фармат прэзентацый, сустрэч з чытачамі і выпрацоўваць новыя падыходы. Але, спадзяюся, у нас атрымаецца праз пэўны час прадоўжыць гэты праект так, як было задумана.

Яшчэ адзін праект, што спрыяе прасоўванню кніг у маладзёжнай аўдыторыі, — рэспубліканскі творчы конкурс буктрэйлераў «Кніга з экрана», зладжаны сумесна з Саюзам пісьменнікаў і непасрэдна БРСМ. Вынікі першага этапу мы падвялі літаральна днямі. Дарэчы, атрымалі цікавы зрэз, якія кнігі пра Вялікую Айчынную вайну выбірае моладзь. Скажу шчыра: нашы чаканні былі крыху вышэйшыя, хацелася ўбачыць сярод больш чым 300 ролікаў сюжэты сучасных кніг, а атрымалі больш класічных, вядомых твораў. Зрабіць так, каб сучасныя аўтары таксама былі запатрабаваныя ў моладзі, — наша задача на перспектыву. Паспрабуем яе вырашыць на наступным этапе, задаючы тэмы з бібліятэчкі кніг да 75-годдзя Перамогі; магчыма, прапануем моладзі выкладваць свае работы ў TikTok, каб крыху спрасціць ім задачу і не выклікаць адчужэння.

Альбо ўзяць такі элемент, які дапаможа кнігам не згубіцца, вылучыцца на паліцах кнігарань, — папяровыя сцікеры з сімволікай 75-годдзя Вялікай Перамогі. Гэта зусім, здаецца, просты ход, але і ён працуе на прасоўванне нашых выданняў, заклікаючы прыцягваць увагу да кніг пэўнай тэматыкі і выступае як своеасаблівы знак якасці кніг, над якімі працавалі прафесійныя аўтары і калектывы.

***— На якія новыя кнігі асабіста вы раілі б звярнуць увагу — нават не з пазіцыі куратара ад Мінінфарма, а проста як цікаўны чытач?***

— Мне здаецца, цікавасць у чытачоў заўжды выклікае мастацкая падача інфармацыі ад першай асобы — аповеды, успаміны і асабістае мастацкае слова на гэту тэму. Адна з такіх кніг выйшла летась у «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі» — успаміны Генадзя Юшкевіча пра легендарную разведгрупу «Джэк», захапляльныя, амаль кінематаграфічныя. А кнігу Івана Муравейкі (выдавецкі дом «Звязда») варта пачытаць не толькі каб уразіцца колькасцю ўзнагарод героя, які прайшоў усю вайну і распісаўся на рэйхстагу, але і каб натхніцца жыццялюбствам, унутранай сілай і ясным, жывым розумам 98-гадовага пісьменніка. Сёлета, дарэчы, плануецца да выхаду яшчэ адна яго кніга, якая, мяркую, будзе цікавая не толькі для землякоў і тых, хто ведае Івана Муравейку як героя Вялікай Айчыннай вайны, але і для самага шырокага чытача.

У пераліку таго, што варта прачытаць, не магу пакінуць без увагі Мікалая Чаргінца, чые кнігі не назавеш гістарызмам у чыстым выглядзе, але яны перадаюць дух эпохі і выклікаюць жывыя эмоцыі: яго «Аперацыю «Кроў» — жудасную гісторыю пра гета ў вёсцы Сёмкава, якая, аднак, многаму вучыць і фарміруе выразнае ўсведамленне таго, што ёсць дабро і што ёсць зло, асабліва моладдзю. Таксама хочацца згадаць перавыданне кнігі Вячаслава Бандарэнкі «Самы доўгі дзень» — за пяць гадоў з часу выхаду кніга была ўжо адзначана пэўнымі ўзнагародамі, а сёлета да яе ўзнік новы вiток інтарэсу. Мне яна таксама вельмі спадабалася — яна лёгка чытаецца і ў той жа час прымушае разважаць пра мір і вайну, здрадніцтва і геройства і тонкую мяжу паміж імі. Яшчэ адзін прыклад вельмі ўдалага мастацка-дакументальнага асэнсавання гераічнага мінулага — «Крыніцы памяці» з вядомай серыі філакартычных альбомаў «У пошуках страчанага». У гэтай кнізе Алесь Карлюкевіч і Уладзімір Ліхадзедаў расказваюць пра беларускія мясціны, звязаныя з лёсамі расійскіх пісьменнікаў, паэтаў, ваенных карэспандэнтаў, многія з якіх удзельнічалі ў баях за беларускія гарады, партызанілі ў нашых лясах...

З прафесійнага пункту гледжання лічу надзвычай цікавай і значнай серыю «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі», якая прадстаўляе погляды навукоўцаў на наша мінулае. Кніга пра спаленыя вёскі, шчыра скажу, прымусіла ўсё ўнутры перавярнуцца, бо Хатынь — сімвал бяды, трагедыі, які ўсім вядомы, але калі дазнаешся, колькі такіх злачынстваў адбылося на тэрыторыі нашай краіны, сухія лічбы перастаюць быць проста лічбамі — і гэта трэба ведаць і помніць.

***— Даводзілася чуць ад пісьменнікаў меркаванне, што вайна не скончана, пакуль не напісаны апошні радок пра яе. Здавалася б, за 75 гадоў столькі сказана — але знаходзяцца новыя сведчанні, раскрываюцца архівы, адшукваюцца пахаванні... На вашу думку, як многа мы яшчэ не ведаем і як доўга трэба расказваць, пісаць пра Вялікую Айчынную?***

— Ведаеце, ёсць рэчы, якія дазваляюць разумець, хто мы такія, дзеля чаго мы існуем, чаму ў нас такія, а не іншыя асаблівасці менталітэту — талерантнасць, цярпімасць, шматканфесійнасць. Чаму старэйшае пакаленне паўтарае: «Абы не было вайны», — і некаторыя з гэтага смяюцца. А смешнага нічога няма, бо людзі, якія перажылі тую страшную навалу, ведаюць цану міру. І калі гэтае стаўленне раптам зменіцца, тады мы зразумеем, што, напэўна, робім нешта не тое і не так — мала кніг пішам, мала фільмаў здымаем, мала гаворым пра тое, што такое вайна і чаму нельга дапусціць яе больш ніколі на нашу зямлю. На сёння, я лічу, трэба працягваць зберагаць і ўшаноўваць нашу гістарычную памяць, ні ў чым не саступаць нашым апанентам, якія ўмеюць піярыць сваю пазіцыю вельмі якасна, шукаць новыя падыходы і формы, размаўляючы з сучасным пакаленнем на яго мове. Грунтавацца на думцы, што захаванне гістрарычнай памяці — не камерцыйны праект. Словам, работы яшчэ шмат.

**Гутарыла Вікторыя ЗАХАРАВА.**


Фота Кастуся ДРОБАВА.

## Звяздоўцы ўшанавалі сваіх калег-герояў

У супрацоўнікаў Выдавецкага дома «Звязда» ёсць добрая традыцыя, перададзеная ім папярэднімі пакаленнямі звяздоўцаў. Штогод напярэдадні знакавых дат — Дня Перамогі, Дня Незалежнасці — яны ўшаноўваюць памяць сваіх калег, якія ў гады вайны выдавалі ў падполлі і ў партызанскай зоне газету «Звязда». Да 75-гадовага юбілею Перамогі кіраўніцтва выдавецкага дома ўсклала кветкі да памятных знакаў у сталіцы. Адзін з іх устаноўлены на вуліцы Кульман, дзе ў 1942 годзе на былой вуліцы Выдавецкай месцілася падпольная друкарня, у якой былі выдадзеныя першыя нумары падпольнай «Звязды». Каля Чырвонага касцёла ў былым Міхайлаўскім завулку ў маі 1942 года фашысты забілі аднаго з кіраўнікоў мінскага падполля, рэдактара газеты Уладзіміра Амельянюка — адзінага ў былым СССР кіраўніка выдання, якога пасмяротна ўганаравалі званнем Героя Савецкага Саюза. Цяпер на гэтым месцы ўвекавечана імя не толькі Уладзіміра Амельянюка, але і іншых падпольшчыкаў, якія мелі дачыненне да выдання падпольнай газеты і загінулі ад рук акупантаў.

Звяздоўцы памятаюць пра подзвіг сваіх папярэднікаў і стараюцца быць вартымі іх памяці і справы, якой яны былі аддадзены да канца.

Уражанні

# ПАРАД ВЕРНАСЦІ ТРАДЫЦЫЯМ

**Парад, які прайшоў у Мінску, выклікаў самы шырокі розгалас сярод творчай і навуковай інтэлігенцыі ў блізкіх да Беларусі краінах. Сваімі ўражаннямі пасля знаёмства праз розныя крыніцы са святочнымі мерапрыемствамі ў Мінску дзеляцца пісьменнікі і вучоныя Расіі, Казахстана, Узбекістана.**

**Валеры ТУРГАЙ, народны паэт Чувашыі** *(Чэбаксары, Расійская Федэрацыя):*

— Уражвае пазіцыя кіраўніцтва краіны, грамадскасці. Вялікая Айчынная вайна — у сэрцах беларусаў. Свята ў Мінску ў знак Вялікай Перамогі стала святам для ўсяго свету! Я бачыў, што парад у Беларусі на знаёмым і сімвалічным для мяне месцы атрымаўся. Слава на ўсе адведзеныя чалавецтву часіны Беларусі і беларусам! Слава гораду-герою Мінску!

Я люблю бываць у вашай краіне. Люблю наведваць музеі і мясціны, дзе захоўваюцца традыцыі памяці пра гераічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. І калі я займаюся мастацкім перакладам, рыхтую публікацыі твораў беларускіх паэтаў на чувашскую мову, то ў мяне на рабочым стале бліжэй за ўсё ляжаць кнігі беларускіх паэтаў-франтавікоў Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Максіма Танка...

**Рэнат ХАРЫС, народны паэт Татарстана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі** *(Казань, Расійская Федэрацыя):*

— А я напярэдадні Дня Вялікай Перамогі ўспомніў мінскага падпольшчыка Івана Кабушкіна. Ён нарадзіўся ў Беларусі, пад Баранавічамі. А жыў і працаваў у даваенны час у Казані. Яму, Кабушкіну, прысвечаны помнік-трамвай, усталяваны ў нашым горадзе, — на гэтым трамваі малады чалавек і працаваў. І 8 мая 2020 года было якраз 55 гадоў з дня прысвоення мінскаму падпольшчыку звання Героя Савецкага Саюза. Давайце помніць разам такіх людзей, такіх самаахвярных беларусаў, рускіх, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў, якія, аддаўшы свае жыцці, далі нам магчымасць святкаваць Дзень Вялікай Перамогі!

**Саліх ГУРТУЕЎ, народны паэт Кабардзіна-Балкарыі, ганаровы старшыня Клуба пісьменнікаў Каўказа** *(Нальчык, Расійская Федэрацыя):*

— Рады і адчуваю гонар за парад Перамогі, праведзены ў вашай краіне! З эмацыянальнай узрушанасцю ўспрыняў словы Прэзідэнта Беларусі пра каштоўнасць нашай агульнай Перамогі, пра каштоўнасць традыцый, пра актуальную барацьбу і сёння з нацызмам.

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны ўсё далейшыя і далейшыя ад нас. Але я і цяпер ведаю ўсіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны з нашай рэспублікі, якія вызвалялі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тэма Беларусі ў судакрананні з Вялікай Айчыннай — святая для балкарцаў, кабардзінцаў тэма. Мой старэйшы сябар, вялікі паэт XX стагоддзя Кайсын Кулієў, сябраваў з беларускімі паэтамі-франтавікамі. Я ганаруся гэтым і па меры сваіх сіл працягваю ўмацоўваць дружбу нашага краю, нашай старонкі, нашых людзей з Беларуссю, беларусамі. Вы зноў паказалі, што ў Беларусі ёсць вышыні, якія яна ніколі не здасць.

**Святлана АНАНЬЕВА, літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук** *(Алматы, Казахстан):*

— Мінск, як заўсёды, велічны ў сваім прыгожым, высокадухоўным стаўленні да мінулага. Адзій Шарыпаў, Сагінгалі Сіітаў — пісьменнікі, якія прычыніліся да ваеннай памяці Беларусі сваімі лёсамі, — сотні сыноў Казахстана, якія ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі за баі ў Беларусі, — мы помнім іх. Мы помнім і адрасы Беларусі, якія далі вечны прытулак нашым землякам. І ведаем, што памяць пра казахстанцаў, якія аддалі свае жыцці за Мінск і Гродна, Брэст і Гомель, Віцебск і Магілёў, — у сэрцах і справах новых пакаленняў беларусаў. Нізкі паклон вам усім з Казахстана за памяць і за Парад Вялікай Памяці. Так і напішыце — з вялікай літары: Парад Вялікай Памяці...

**Мікалай ЧАРКАШЫН, капітан першага рангу ў адстаўцы, пісьменнік, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя В. Пікуля** *(Масква, Расійская Федэрацыя):*

— Настрой 9 Мая мне стварыў і ўрачысты парад у Мінску. Бачыў, як дастойна святкуе Беларусь 75-годзе Вялікай Перамогі.

Я цяпер пішу раман-дылогію, падзеі якога разварочваюцца і ў Першую сусветную, і ў Вялікую Айчынную на роднай мне Гродзеншчыне. Нарадзіўся ж я ў Ваўкавыску. І такая работа і ёсць мая Перамога, мой унёсак у памяць пра землякоў, пра бацьку, які ваяваў пад Віцебскам, быў узнагароджаны за подзвіг на беларускай зямлі.

І канешне ж, вельмі хочацца ў Мінск, у Брэст, у Віцебск. Прыехаць і падысці да помнікаў, пакланіцца ім... Адчуць сувязь з пакаленнем пераможцаў.

**Кучкор НАРКАБІЛ, пісьменнік, журналіст** *(Ташкент, Узбекістан):*

— Мінск, Беларусь чарговы раз мяне ўразілі. Я нейкі час таму гасцяваў у сталіцы Беларусі. Быў і ў музеі Вялікай Айчыннай вайны, і на плошчы каля абеліска Перамогі. І пад уражаннем эмоцый, якія ахапілі мяне, прайшоўся па Парку Перамогі. Мае развагі насілі і носяць таксама канкрэтны характар: пішу мастацкі твор пра першыя дні Вялікай Айчыннай. Дзеля гэтага некалькі разоў прыязджаў у Беларусь. Быў у Хатыні, адкрыў для сябе гісторыю спаленай фашыстамі пухавіцкай вёскі Беразянка. І многія старонкі маёй кнігі ўжо напісаны. А цяпер пад уражаннем таго, што беларусы правялі ў знак 75-годдзя Вялікай Перамогі такі шчыры і такі адкрыты парад памяці, я абавязкова яшчэ дапішу раздзел пра Мінск сённяшні, Мінск, які памятае, які захоўвае традыцыі.

**Запісаў Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

Сямейная гісторыя

# ЗАГІНУЎ НА МЦЭНСКІМ ПЛАЦДАРМЕ

## Як бабуля знайшла свайго бацьку

**Дзяцінства маёй бабулі пачалося ў Сталінградзе — яшчэ да вайны яе бацькі Лідзія і Мікалай Рамановічы працавалі там на трактарным заводзе, хоць і былі родам з Уздзенскага раёна. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, сям'я жыла ўжо ў Арлоўскай вобласці — маёй бабулі толькі споўнілася чатыры гады, яе сястры Тамары было дзевяць, а брату Віталю — два.**



Мікалай РАМАНОВІЧ. Загінуў у 1943 годзе ў Мцэнскім раёне Арлоўскай вобласці.

У 1941 годзе прадзед працаваў галоўным механікам на машынна-трактарнай станцыі (МТС). З-за хуткага наступу немцаў усю тэхніку пачалі адпраўляць у эвакуацыю. Таму прадзед атрымаў бронь і разам са сваёй сям'ёй і трактарамі адправіўся на ўсход. Дайшлі яны толькі да станцыі Дворык Валоўскага раёна, што ў Тульскай вобласці. Там ім далі прытулак мясцовыя жыхары. Але прадзед Мікалай пакінуў трактары на мясцовай МТС і вярнуўся ў раённы ваенкамат ў Валова, нягледзячы на тое што ў яго была бронь.

Дарэчы, гэта было ўсё, што ведала мая бабуля пра свайго бацьку, — яны не атрымалі ні аднаго ліста з фронту, і толькі ў 80-я гады яе сястра Тамара, якая так і засталася жыць у Тульскай вобласці, знайшла яго магілу. Як высветлілася, ён загінуў 13 лютага 1943 года, а пахавалі яго ў брацкай магіле каля вёскі Калінеева Мцэнскага раёна Арлоўскай вобласці.

На гэтым гісторыя магла і скончыцца, але некалькі гадоў таму я наткнулася на абагульнены банк даных «Мемарыял», дзе збіраюць інфармацыю пра абаронцаў Айчыны, якія загінулі ці прапалі без вестак у час вайны і пасляваенны перыяд. Менавіта адтуль мы даведаліся, што мой прадзед Мікалай служыў у 858-м стралковым палку. Астатнюю ж інфармацыю мы знайшлі ў электронных архівах, СМІ Мцэнскага раёна і кнігах «Памяць».

Як высветлілася, 858-ы стралковы полк уваходзіў у склад 283-й стралковай Гомельскай чырванасцяжнай ордэна Суворава II ступені дывізіі, якую фарміравалі ў Арлоўскай ваеннай акрузе каля горада Шчыгры Курскай вобласці. У верасні 1941 года склад дывізіі прыбыў на станцыю Клюкоўнікі Наўлінскага раёна Бранскай вобласці, дзе тая ўлілася ў дзеючую армію ў складзе Бранскага фронту. У верасні, калі ішлі баі з немцамі за Грамячку, гэтая дывізія страціла шмат людзей. А ў час Арлоўска-Бранскай аперацыі (з 30 верасня да 23 кастрычніка) трапіла ў акружэнне, але яго ўдалося прарваць і разграміць штаб нямецкай механізаванай дывізіі. Наогул гэтая аперацыя дазволіла савецкім войскам спыніць буйныя сілы праціўніка і сарваць іх планы абходу войскаў Заходняга фронту і Масквы з поўдня.

Пасля Арлоўска-Бранскай аперацыі да канца кастрычніка 283-я дывізія прыкрывала курскі напрамак, а потым яе перакінулі ў раён горада Яфрэмаў Тульскай вобласці, дзе дывізія ўвайшла ўжо ў склад 3-й арміі Бранскага фронту. У лістападзе там былі асабліва бязлітасныя баі — палкі дывізіі адцягнулі на сябе частку сіл праціўніка з тульскага напрамку, што дазволіла сарваць планы немцаў па захопе Тулы.



Ліст ад Паўла ВАЎЧЭЦКАГА з фронту. 11 сакавіка 1944 года.

З мая 1942 года і да 7 лютага 1943 года дывізія абараняла важную чыгуначную магістраль і шашу Арол—Масква на Мцэнскім плацдарме. Пры гэтым яна перыядычна вяла наступальныя дзеянні, не даючы праціўніку з боку Арла праваца на Тулу і Маскву. Наогул нямецкае вярхоўнае камандаванне надавала Мцэнскаму плацдарму на тульскім напрамку асабліва важнае значэнне, бо разглядала магчымасць пачаць адтуль наступ на Маскву.

З 13 лютага пачаліся ўжо новыя баявыя дзеянні, і ў першы ж іх дзень каля вёскі Верхняе Ушчарава Мцэнскага раёна і загінуў мой прадзед Мікалай. Ужо ў ліпені гэтага ж года дывізія прадзеда брала ўдзел у Арлоўскай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Кутузаў», якая з'яўлялася складнікам Курскай бітвы, і была ўведзена ў бітву на Арлоўскім выступе. Дарэчы, да канца ліпеня 1943 года 283-я, 342-я, 380-я, 269-я



Павел ВАЎЧЭЦКІ. Прапаў без вестак у сакавіку 1944 года.

і 308-я стралковыя дывізіі цалкам вызвалілі Мцэнскі раён Арлоўскай вобласці ад немцаў. Адразу пасля гэтага на тэрыторыі раёна пачалося размініраванне і пахаванне загінулых. Чырвонаармейцаў, якія загінулі ў баях 1942—1943 гадоў, хавалі мясцовыя жыхары. Вось і мой прадзед Мікалай быў пахаваны ў адной з самых буйных брацкіх магіл Арлоўскай вобласці, дзе цяпер спачывае 1080 воінаў. Мемарыял на тым месцы з'явіўся ў 1968 годзе, але да 70-годдзя Перамогі была праведзена яго рэканструкцыя.

* * *

Акрамя бацькі, на вайну пайшлі і дзядзькі маёй бабулі. Адзін з братоў прабабулі Ліды Пётр Ваўчэцкі вярнуўся з вайны без нагі, а другі, Павел, прапаў без вестак у сакавіку 1944 года. Аднак яшчэ 11 сакавіка яна атрымала ад яго ліст, які і сёння захоўвае мая бабуля разам з фотаздымкамі. Двое ж братоў прадзеда Мікалая вярнуліся з вайны інвалідамі, а яго брат Іван, якога прызвалі ў 1944 годзе ва Уздзе, памёр ад ран у лютым 1945 года і быў пахаваны на тэрыторыі сучаснай Польшчы.

Прабабуля Лідзія, якая адна выхавала траіх дзяцей, у 1946 годзе атрымала медаль «За доблесную працу ў час Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.», а на радзіму ва Узду вярнулася толькі ў 1956 годзе.

**Валерыя КІСЛАЯ.**

Нафантазіруй гэта

# НАЙБОЛЬШ ЯРКІЯ ТВОРЧЫЯ ІДЭІ, ПРЫДУМАНЫЯ ПАДЧАС КАРАНЦІНУ

**Вымушанае знаходжанне дома і абмежаванне кантактаў адных людзей прыводзяць у адчай, а ў другіх абуджаюць творчы пачатак, пачуццё гумару і фантан ідэй. «Звязда» ўпэўнена, што лепш быць разам з тымі, хто, каб палегчыць працу ўрачоў, застаецца дома, але не апускае рукі і падтрымлівае маральны дух у сабе і іншых. Паглядзіце: магчыма, некаторыя з гэтых спосабаў падыходзяць і вам?**

**Анлайн-трансляцыі.** Натуральна, такі фармат сасункаў з аўдыторыяй шырока выкарыстоўваўся і раней, у дапандэмічную эпоху, але цяпер распаўсюдзіўся практычна на ўсе сферы, якія толькі можна перанесці ў віртуальнасць, — тэлепраграмы, фільмы, канцэрты, спектаклі, музейныя экскурсіі, майстар-класы, навуковыя канферэнцыі, вучэбныя праграмы, заняткі спортам і многае іншае.



Флэшмоб з падушкай. Баранавічы.

З аднаго боку, мы аказаліся як ніколі залежныя ад якасці інтэрнэт-сігналу, з другога — самаізаляцыя дазволіла пaглядзець усё тое, на што заўжды не ставала часу: найбуйнейшыя музеі, тэатры, галерэі адкрылі доступ да сваіх фондаў, выклалі архіўныя запісы самых вядомых пастановак ці спецыяльна запісалі новыя, каб не губляць сувязі з гледачамі. Тое самае зрабілі практычна ўсе вядучыя беларускія тэатры — калі яшчэ можна паглядзець у зручны час славутыя оперныя і балетныя спектаклі Вялікага (на бягучым тыдні гэта «Дзікае паляванне караля Стаха» 1989 года запісу), пачытаць разам з купалаўцамі і ўбачыць у праекце «Купалаўскі дома» легендарныя пастаноўкі, як гэта зрабілі ўжо звыш 65 тысяч гледачоў па ўсім свеце, далучыцца да адмысловага спектакля-чыткі Рускага тэатра «Баль падчас чумы» паводле «Маленькіх трагедый» Аляксандра Пушкіна.

Яшчэ адзін від выхаду мастацтва ў масы праз інтэрнэт — творчыя флэшмобы і чэленджы. Напрыклад, расійскія артысты пад хэштэгам #ЖитьЛюбитьТворить чытаюць анлайн казкі і вершы, спяваюць, дэманструюць свае малюнкі. Пад неафіцыйным дэвізам «Мода ад Каранціну» дарослыя распачалі адну з любімых дзіцячых гульняў — пераапрананне ў адзенне жонкі/мужа і дэманстрацыю атрыманых «модных вобразаў». Шведскія блогеры распачалі «падушачны флэшмоб», сутнасць якога ў тым, каб зрабіць сабе ўбор з падушкі, рэменя і модных аксесуараў, — прымерыла падушкі на сябе ўжо больш за 160 тысяч удзельнікаў, у тым ліку мужчыны, дзеці і нават коцікі. Славуты футбаліст Крыштыяну Раналду запусціў для прыхільнікаў спаборніцтва на «Кубак гасцінай». Каб яго атрымаць, трэба пераўзысці рэкорд спартсмена і за 45 секунд пракачаць прэс больш чым 142 разы.




Шакалад «Алёнка».

Беларускія спявачкі Жанет, Вікторыя Алешка і многія іншыя далучыліся да флэшмобу «Эстафета мыцця рук» — відэазапісы з ванных пакояў перадаюць адно аднаму эстрадныя артысты, некаторыя чытаюць «Майдадыра» ці ўключаюць музыку з аднайменнага мультфільма, каб вытрымаць рэкамендаваную працягласць мыцця.

**«ІЗОізоляция»** — творчы «антыхандрычны» праект, які гэтай вясной стаў у рускамоўнай інтэрнэт-прасторы вірусным у добрым сэнсе слова. Сутнасць прыдумкі можна апісаць у некалькіх словах: увасобіць наноў падручнымі сродкамі славутыя мастацкія шэдэўры, скульптуры, плакаты, фотаздымкі і гэтак далей, а потым размясціць з адпаведным хэштэгам #изоизоляция арыгінал і вынік уласнай фантазіі і ўмелых рук у сеціва і атрымаць зваротную рэакцыю ад іншых карыстальнікаў. Можна прыцягваць да ўдзелу дзяцей, хатніх жывёл, скарыстоўваць прадметы побыту — галоўнае, каб работа была выкананая шчыра, без дамалёвак у фоташопе, толькі ўласнымі сіламі. Аўтарам творчай акцыі выступіла супрацоўніца Mail.Ru Кацярына Брудная-Чалядзінава — як кажа яна сама, паколькі ўсе блізкія і сябры нерваваліся і адчувалі моцны стрэс, хацелася неяк разварушыць іх, прапанаваць нейкую арт-тэрапію. Напрыканцы сакавіка Кацярына сфатаграфавала свайго мужа ў вобразе Ван Гога, выклала здымак у сеціва і прапанавала сябрам далучыцца да пераробкі вядомых фота і карцін. «Мы



Рафаэль. «Пані з адзінарогам».



Рафаэль. «Мадонна».

проста хацелі палепшыць маркотныя і трывожныя будні на самаізаляцыі і разам пасмяяцца, а вось што атрымалася», — заўважае стваральніца праекта.

Літаральна за тыдзень маленькі сяброўскі флэшмоб перарос у маштабную творчую акцыю і стаў сапраўдным хітом у сецiве. Падобныя творчыя ініцыятывы ў сувязі з каранціннымі мерамі, дарэчы, ініцыявалі культурныя ўстановы ў Нідэрландах і ЗША, аднак рускамоўная версія істотна абышла іх па папулярнасці. На гэты момант суполка праекта ў сацсетках налічвае амаль 600 тысяч удзельнікаў з больш чым 100 краін свету! Людзі рознага ўзросту, прафесій і сацыяльнага статусу «ажыўляюць» рускую і сусветную мастацкую класіку (найбольш папулярнымі сталі Рэне Магрыт — толькі лянівы не перайначыў яго «Заказаных», што цалуюцца праз мяшкі, — Энздзі Уорхал, Ян Вермеер, Леанарда да Вінчы, Валянцін Сяроў, Пабла Пікаса, а таксама Фрыда Кало, Эдвард Мунк, Вінцэнт Ван Гог, Вася Ложкін), музейныя экспанаты, вядомыя агіткі, афішы, кадры з любімых кінафільмаў і нават... абгорткі ад шакаладу — асабіста давялося ўбачыць пяток сучасных версій «Алёнкі», ад адкрытай пароды да незвароднага падабенства. Мастацтвазнаўцы заўважаюць, што акрамя прадказальных і агульнавядомых сюжэтаў у флэшмобе ёсць мноства свежага, арыгінальнага крэатыву — а значыць, гэта ўжо «не імітацыя, а інтэрпрэтацыя», своеасаблівая новая форма сеціўнага мастацтва. Творчая ініцыятыва атрымала такую падтрымку, у тым ліку ад Эрмітажа, што 30 красавіка выйшла электронная кніга «Ізаізаляцыя» з прыкладна 100 найлепшымі работамі, якія натхняюць удзельнікаў на далейшую творчасць — як аптымістычна заўважаюць аўтары ідэі, да канца каранціну і пасля яго.

**Аўтамабільныя канцэрты.** Калі аўтакінатэатры — з'ява звыклая, дзесьці распаўсюджаная, а дзесьці ўжо і як след падзабытая (напрыклад, сталічны аўтакінатэатр у мікрараёне Малінаўка, адкрыты ў 2003 годзе, не працуе ўжо некалькі гадоў), то канцэрты для аўтамабілістаў — новы фармат, выкліканы да жыцця падчас лакдаўну. Нагадаем, каранцінныя меры практычна ва ўсіх краінах, якія змагаюцца з пандэміяй каранавіруса, прадугледжваюць адмену ці перанос масавых мерапрыемстваў. Так, найбуйнейшае ў свеце неспартыўнае тэлешоу «Еўрабачанне» арганізатары перанеслі на 2021 год, як і брытанскі фестываль «Гластонберы», самы папулярны сярод электроншчыкаў Ultra Music Festival у Фларыдзе адмянілі, Tallinn Music Week у Эстоніі пакуль што перанеслі на жнівень, а каліфарнійскі фестываль Coachella — на кастрычнік.

Але музыканты, арганізатары і прадзюсары не былі б творчымі асобамі, калі б не знайшлі выйсце. У сярэдзіне красавіка ў Літве стартаваў спецыяльны цыкл канцэртаў пад адкрытым небам, які наведвальнікі глядзяць і слухаюць з аўтамабіляў. Пры гэтым дзейнічае шэраг абмежаванняў: у адной машыне можа быць не больш за два



Аўтаканцэрт.

чалавекі, калі толькі гэта не сям'я, гук транслюецца праз радыёпрыёмнік аўто на спецыяльнай частаце, а ўзмацняльнікі выключаныя, каб не было спакусы выйсці з машыны і кінуцца ў скокі. Такія канцэрты выхаднога дня запланаваныя як мінімум да сярэдзіны мая. Аналагічныя імпрэзы днямі адбыліся ў Даніі, дзе 500 білетаў на аўтаканцэрт Мадса Лангера былі раскупленыя за пару дзясяткаў хвілін, і ў нямецкім горадзе Шуторф — тут на рэйв пад адкрытым небам пусцілі толькі 250 аўто.

І гэта толькі частка крэатыўных ідэй, аўтары якіх пацвярджаюць, што нават на дыстанцыі можна быць бліжэй і падтрымліваць адно аднаго, каб вымушаная ізаляцыя ў чатырох сценах не здавалася такой бясконцай. Хоць, напэўна, усе мы па розныя бакі экранаў камп'ютараў і гаджэтаў зразумелі, якая гэта раскоша — жывыя чалавечыя стасункі, і з нецярпеннем чакаем вяртання да больш-менш звыклага рытму жыцця. Беражыце сябе, калі ласка, — і, калі ёсць магчымасць, аздабляйце будні творчасцю.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з сацыяльных сетак.**

75 гадоў Вялікай Перамогі. Беларусь ПАМЯТАЕ!

# ТУРЫЗМ НА ПАЎЗЕ

## Куды «вырвацца» пасля пандэміі?



**Ужо з 15 мая ў курортных зонах Егіпта будзе адноўлена работа гатэляў. Пакуль што гэта закране толькі ўнутраны турызм, паведаміла выданне Al Ahram. Загрузка гасцініц на першым этапе будзе на ўзроўні 25 працэнтаў. На пачатку чэрвеня яна павялічыцца да 50 працэнтаў. Міністр турызму і старажытнасцяў краіны Халед аль-Анані заявіў, што гатэлі адкрыюць толькі пры ўмове выканання шэрагу прадпісанняў. Парушальнікі могуць пазбавіцца ліцэнзій. Раней аль-Анані ўдакладніў, што калі граніцы краіны адкрыюцца для замежнікаў, першы час плануецца пускаць у Егіпет толькі турыстаў, не старэйшых за 48 гадоў. Пры гэтым госці павінны будуць мець так званы «пашпарт здароўя». Калі ж больш-менш адновіцца сусветны турыстычны трафік і які будзе глабальны «шпацыр»?**

### Мінус 2 трыльёны долараў

Адзін з самых смяротных канфліктаў у гісторыі чалавецтва, Першая сусветная вайна, як ні дзіўна, даў штуршок бурнаму развіццю турызму ў міжваенную эпоху, згадвае interfax.ru. Яшчэ да 1914 года паступова пачала расці папулярнасць пляжнага адпачынку, водных відаў спорту і катання на лыжах у гарах. А падчас вайны, якая стала часам вымушанага перамяшчэння велізарных мас людзей, мільёны адпраўлялі сваім сем'ям паштоўкі і фатаграфіі. Наглядзеўшыся на чароўныя віды, людзі захацелі ўбачыць новыя месцы на свае вочы. Гэта прывяло да ўсплёску падарожжаў, запал да якіх быў падмацаваны паступовым увядзеннем у еўрапейскіх краінах аплатных водпускаў.

Яшчэ праз 10 гадоў турызм атрымаў новы імпульс для развіцця, калі ў выніку эканамічнага крызісу 1929 года сталі занепадаць еўрапейскія фешэнебельныя гатэлі, якія не змаглі адаптавацца да зменлівага попыту. Тады нават забяспечаная публіка пачала выкарыстоўваць для адпачынку танныя кемпінгі. Акрамя таго, пасля крызісу марскія курорты пачалі запрашаць турыстаў у летні сезон, каб кампенсаваць страты ад адтоку сваёй традыцыйнай багатай кліентуры, якая прыбыла праводзіць зімы ў цёплым клімаце.

Кожны наступны крызіс ствараў новыя магчымасці для турызму. Так, падчас фінансавага крызісу 2008 года продажы традыцыйных турпакетаў упалі, але пачалі бурна развівацца сэрвісы сумеснага выкарыстання нерухомасці і іншых паслуг, такія як Airbnb, BlaBlaCar і іншыя, якія даваляюць спажыўцам падарожнічаць эканомна.

Крызіс турызму, звязаны з каранавірусам, — адно з самых цяжкіх выпрабаванняў для сусветнай тургаліны за многія дзесяцігоддзі. Тут меркаванні экспертаў разыходзяцца. «Глабальны фінансавы крызіс, памножаны на пяць», — такім чынам Сусветны савет па турызме і падарожжах (WTTC) ацаніў наступствы пандэміі для сваёй галіны. Паводле ацэнак WTTC і Oxford Economics, унёсак турыстычнай індустрыі ў глабальны ВУП па выніках гэтага года скароціцца на траціну (летась гэта былі ўнушальныя 10,3 %). Пакуль Сусветны савет па турызме і падарожжах сцвярджае, што страты сусветнай турыстычнай галіны складуць больш за два трыльёны долараў. Прагноз АЭСР яшчэ больш песімістычны: спад у турыстычнай індустрыі складзе ад 50 % да 70 %, як мінімум кожны трэці з занятых у ёй 330 мільёнаў чалавек можа пазбавіцца работы.

### Камеры на авечках

У Еўропе кампаніі турыстычнай галіны просяць нацыянальныя ўрады абараніць моцна пацярпелую індустрыю, дазволіўшы выдаваць турыстам ваўчары на будучыя падарожжы замест вяртання ўжо ўнесенай перадаплаты за адпачынак, які не адбыўся. Аднак гэта супярэчыць адзінаму еўрапейскаму заканадаўству. Пакуль еўрапейскія ўрады спрачаюцца з Еўракамісіяй, мясцовыя ўлады спрабуюць прадаваць «турыстычныя ф'ючарсы», каб падтрымаць галіну. Так, улады Сіцыліі маюць намер выдаткаваць 50 мільёнаў еўра з адмысловага фонду на бронь нумароў у гасцініцах рэгіёна, а затым прадаваць турыстам ваўчары на гэтыя нумары.

На долю турызму ў ЕС прыпадае 10 % ВУП і 12 % усіх занятых. Самая залежная ад турызму краіна ў свеце — Мальдывы: гэтая галіна фарміруе 40 % яе эканомікі, а з улікам ускосных эфектаў — прыблізна дзве трацiны. Райскія астравы, на шчасце, аказаліся практычна не закрануты COVID-19, але эканамічны ўдар пандэміі там будзе самы моцны ва ўсёй Паўднёвай Азіі. Мальдывы атрымалі дапамогу МВФ і Сусветнага банка і гатовыя адкрыць астравы для турыстаў не пазней за кастрычнік.

Каб стымуляваць тых людзей, якія аплацілі туры, не адмаўляцца ад браніравання, агенцтва развіцця турызму Фарэрскіх астравоў распрацавала сэрвіс аддаленага турызму. Віртуальныя туры праходзілі на працягу 10 дзён у красавіку: мясцовыя жыхары з вэб-камерамі хадзілі па маляўнічых месцах і былі нагамі і вачыма турыстаў, якія кіравалі іх рухамі з дапамогай джойсціка. Дарэчы, тут не ўпершыню звяртаюцца да лічбавых тэхналогій для развіцця турызму: у 2017-м у сэрвісе Google Street View з'явілася магчымасць «пабадзяцца» па Фарэрах з дапамогай камер, якія прымацавалі на... авечак.

### Ці ўвядуць «пашпарты здароўя»?

Спачатку да ўрача, потым па візу або ў аэрапорт — яшчэ ў сярэдзіне красавіка эксперт незалежнага еўрапейскага інфармацыйнага рэсурсу па пытаннях Шэнгена Граніт Садзіку выказаў здагадку, што менавіта такі будзе турызм пасля пандэміі. Без тэста на каранавірус нікуды не пусцяць. У Еўракамісіі гэта не пракаменталі, але Садзіку падтрымліваюць турыстычныя арганізацыі.

Напрыклад, у Грэцыі збіраюцца ўвесці «пашпарты здароўя» для замежнікаў. Міністр турызму Харватыі Гары Капелі расказаў, што абмяркоўваецца «агульны дакумент, штосьці накшталт «пашпартоў COVID-19», сапраўдных ва ўсіх дзяржавах ЕС».

Праўда, эксперты нагадваюць, што «пашпарты здароўя», як і каранцін перад паездкай, — не панацэя. Турыст можа заразіцца ў аэрапорце, у таксі, на месцы адпачынку. Таксама пропускам не могуць служыць і імунныя пашпарты аб наяўнасці антыцелаў да каранавіруса: як адзначаюць спецыялісты, пакуль няма афіцыйных пацвярджэнняў таго, што перахварэлы чалавек не здольны заразіцца паўторна. Таму само па сабе выздараўленне нічога не гарантуе. Больш тое, «імунны пашпарт» можа стварыць ілюзію бяспекі і, адпаведна, прывесці да новай успышкі захворвання.

### Квіток у «крэсла Януса»

Паводле звестак Міжнароднай асацыяцыі паветранага транспарту (IATA), у красавіку колькасць рэйсаў скарацілася на 80 працэнтаў у параўнанні са студзенем. У ЗША колькасць пасажыраў, якія штодня здзяйсняюць авіяпералёты, вярнулася на ўзровень 1954-га, калі толькі пачыналася эра рэактыўных самалётаў. 70 % сусветнага авіяцыйнага флоту стаіць на прыколе — самалётамі забітыя ўзлётна-пасадачныя палосы, рулёжныя дарожкі і нават ваенныя базы.

Падчас лакдаўна міжнародныя авіямаршруты задзейнічаны толькі для вяртання людзей на радзіму і выконваюцца з улікам новых патрабаванняў бяспекі. Так, авіякампанія Emirates першая пачала праводзіць экспрэс-тэсты ўсіх пасажыраў, якія вылятаюць з Дубая ў родныя краіны, на COVID-19. Абавязковы аналіз можа стаць новай нормай — аналагічныя меры разглядаюць і іншыя авіякампаніі. Напрыклад, Etihad тэсціруе стойкі самастойнай рэгістрацыі, дзе вымяраюць тэмпературу.

Авіякампаніі асвойваюць сацыяльнае дыстанцыяванне. У Тайландзе з 1 мая аднавілі ўнутраныя рэйсы. Але па новых правілах даступныя толькі 70 працэнтаў месцаў у самалётах (сярэдняя крэслы займаць нельга), пасажыры павінны быць у масках, не дазваляецца ніякіх напояў і харчавання на борце. Павялічаная дыстанцыя паміж авіяпасажырамі таксама можа стаць новай рэальнасцю: Еўрасаюз разглядае заканадаўчую забарону на продаж білетаў на месцы пасярэдзіне ў шэрагу з трох крэслаў. Італьянскае бюро Aviointeriors, якое распрацоўвае дызайн інтэр'ераў для самалётаў, ужо прадставіла супрацьвірусныя варыянты: «крэсла Януса» (пасажыры на сядзеннях пасярэдзіне будуць знаходзіцца спінай па ходзе руху), а таксама празрыстыя ахоўныя «брылі» над кожным з крэслаў.

### Робаты на рэсепшане

Гасцініцы рыхтуюцца ўводзіць павышаныя санітарныя стандарты. Marriott мяркуе выдаваць пастаяльцам санітайзеры і перапланаваць інтэр'ер з улікам патрабаванняў сацыяльнага дыстанцыявання, пра аналагічныя планы заявілі і іншыя гасцінічныя сеткі. А сэрвіс Airbnb уводзіць абавязковы 72-гадзінны каранцін пасля выезду пастаяльцаў.

Іспанскі курортны горад Алікантэ ўвядзе сертыфікаты Covid Free для гатэляў, якія будуць выконваць новыя стандарты гігіены: персанал у масках, забарона на буклеты, галасавое кіраванне ў ліфтах, шкляныя бар'еры на стойцы рэсепшану. Правілы закрануць і гасцей: дыстанцыя 1,5 метра ў агульных зонах, забарона на поціскі рук, абдымкі і пацалункі, а таксама пастаянная дэзынфекцыя рук. Аналагічная сертыфікацыя гатэляў можа быць уведзена і ў іншых краінах — напрыклад, у Партугаліі.

Сацыяльнае дыстанцыяванне як новая норма можа даць штуршок аўтаматызацыі сферы гасціннасці. Напрыклад, у Ганконгу і Сінгапуры гатэлі плануюць мінімізаваць кантакты паміж людзьмі, замяняючы персанал на робатаў, якія будуць разносіць ежу і напоі, выклікаць ліфт, дапамагаць госцю знайсці свой пакой.

У казіно і гатэлях Лас-Вегаса будуць устаноўлены цеплавізары, а ўсім гасцям раздадуць маскі. У залах правядуць перапланіроўку з улікам патрабаванняў сацыяльнага дыстанцыявання. Крупʼе і іншыя супрацоўнікі таксама будуць абавязаны насіць маскі, а ў залах з'явіцца дадатковы персанал для дэзынфекцыі гульнявых аўтаматаў. Зрэшты, нашэнне масак пакуль выклікае пытанні ў казіно, бо абцяжарыць работу службы бяспекі.

Дыснейлэнды могуць увесці абавязковае вымярэнне тэмпературы пры ўваходзе па аналогіі з кантролем асабістых рэчаў. Першым аб'ектам гэтай сусветнай сеткі, які пачаў вяртанне да работы, стаў парк Шанхаі, але пакуль адкрыты толькі рэстараны і крамы, а не атракцыёны. Тут абавязковае нашэнне масак і захаванне сацыяльнай дыстанцыі.

### Што з all inclusive?

У Іспаніі плануюць забяспечыць сацыяльнае дыстанцыяванне на пляжах з дапамогай розных бар'ераў — конусаў, вяровак. Прычым гаворка пакуль ідзе толькі пра мясцовых жыхароў. Мяркуецца стварэнне зон адпачынку Covid Free (без рызыкі інфекцыі). У Ізраілі для гатэляў уводзяць спецыяльны стандарт «Фіялетавы знак», які дазваляе працаваць у перыяд пандэміі. Спачатку гасцей пусцяць у цымер — невялікія катэджы, а таксама ў гасцініцы, дзе ёсць нумары з асобным уваходам. Потым адкрыюць усе астатнія, але з дастаўкай харчавання па нумарах і без выкарыстання грамадскіх прастор. Затым запрацуюць кавярні і рэстараны з захаваннем сацыяльнай дыстанцыі.

Між тым міністр культуры і турызму Італіі Дарыа Франчэскіні дапусціў, што ў маі ў краіне адновіцца работа музеяў і галоўных славутасцяў — у прыватнасці, Калізея і Пампей, паведамляе газета La Repubblica. На пляжах могуць з'явіцца кабінкі з плексігласу (арганічнага шкла), а таксама жывыя загарадзі.

Грэцыя гатовая аднавіць турыстычную дзейнасць ужо ў чэрвені, паведаміў дзяржаўны міністр Акіс Герапетрыцiс. Ён падкрэсліў, што грэчаскія курорты, у якіх назіралася невялікая захваральнасць на каранавірус, будуць гэтым летам «надзвычай запатрабаваныя». Тым не менш міністр турызму краіны Харыс Тэахарыса лічыць, што турыстычны сезон з удзелам замежных гасцей усё ж пачнецца ў ліпені, а праз павышаны попыт можа працягнуцца да лістапада.

Турыстычны сезон у Турцыі можа адкрыцца ўжо ў канцы мая, паведаміў міністр культуры і турызму краіны Мехмет Нуры Эрсой у эфіры тэлеканала NTV. Тым не менш прыбыццё ў краіну замежных турыстаў пачнецца не раней за сярэдзіну чэрвеня, заявіў чыноўнік. У Турцыі гасцям не варта разлічваць на сістэму «ўсё ўключана» ў класічным выглядзе. Хутчэй за ўсё турыстам прапануюць сэрвіс а-ля карт, прычым столікі паставяць на бяспечнай адлегласці адзін ад аднаго. Будуць і іншыя абмежаванні.

### Жаданне мацнейшае за страх

Звычкі падарожнікаў таксама могуць змяніцца. Пра гэта прафесар Джозеф Чыр з Цэнтра па даследаванні праблем турызму японскага Універсітэта Вакаяма расказаў РІА «Навіны». Ён спрагназаваў, што ў турыстаў з'явяцца новыя звычкі, пераважна звязаныя з санітарна-гігіенічнымі нормамі і стандартамі чысціні. Так, турысты будуць даплачваць за месцы ў малалюдным транспарце і прыдзірліва выбіраць месца размяшчэння, у прыватнасці хостэлы і круізныя лайнеры, які Чыр лічыць найбольш спрыяльнымі для распаўсюджвання віруса месцамі.

Паводле яго слоў, зніжэнне попыту на падарожжы будзе заўважнае ў кароткатэрміновай перспектыве, аднак бенефіцыярам ад гэтага часова стане ўнутраны і экалагічны турызм. У цэлым індустрыя хутка верне свае пазіцыі, асабліва ў тым выпадку, калі будзе распрацавана вакцына, заўважыў спецыяліст. «Упэўнены, што жаданне людзей падарожнічаць у выніку будзе мацнейшае за існуючыя страхі і сумневы», — растлумачыў Джозеф Чыр.

Пры гэтым зменяцца цэны. Туры падаражэюць, упэўненыя эксперты. Авіякампаніі і гатэлі недалічацца многіх кліентаў, а меры бяспекі — напрыклад, стэрылізацыя пакояў і нават сталовых прыбораў — запатрабуюць павелічэння колькасці персаналу.

**Захар БУРАК.**

## Извещение о проведении 27 мая 2020 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование, отдельные характеристики, местонахождение продаваемого имущества) | «Административно-бытовой корпус АБЗ «Гореничи» общей площадью 204 кв. м, инв. № 611/С-916; «складское помещение для хранения дров» общей площадью 39 кв. м, инв. № 611/С-34214; «техническое помещение для обслуживания водонапорной башни» общей площадью 10,2 кв. м, инв. № 611/С-34215; стол «Амадей» т102 (1 шт.); силовой тренажер HouseFit DH – 8157 (1 шт.); бильярд «Магнат – Плюс» 8 фут. (1 шт.); машина стиральная Gorenje WS43101 (1 шт.); водонагреватель Ariston SG HP 200V (1 шт.); киевница напольная ПАЖ-2 (материал – ясень) (1 шт.); светильник «Венеция» (1 шт.); стул «Амадей» s102 (6 шт.); стул ИСО Black (15 шт.); тумба для ТВ «Ниагара» (2 шт.); чехол защитный для бильярдного стола 8ф (1 шт.); шары «Арамит Премьер» (1 шт.); шкаф с витриной «Дэнвер-Э-9М» (1 шт.); электросушилка для рук Puff-8820 (3 шт.); антенна Variant 60 (2 шт.); бра Орхидея 13200/2 (4 шт.); зеркало (1 шт.); жалюзи вертикальные Лайн 1,5*2,2 кв. м (1 шт.); жалюзи вертикальные Лайн 1,7*1,7 кв. м (4 шт.); кий «Гигант-М», 2РС двухсоставной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); кий «Онтарио» 1РС целый, 149 см (материал: канадский клен) (4 шт.); кий «Ярость», 2РС двухсоставной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); мягкий уголок «Лагуна комфорт» (1 шт.); емкость подземная, горизонтальная, металлическая 50 м³ (1 шт.); телевизор «Горизонт» 21KF19V (1 шт.); цифровой спутниковый ресивер Eurosat DVB-3023 (1 шт.) |
| **Местонахождение** | Минская обл., Березинский р-н, Капланецкий с/с, 2, 2/1, 2/2 |
| **Сведения о земельном участке** | площадь: 2,3610 га, кадастровый номер: 620482302101000151 |
| **Продавец имущества** | ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253 |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС** | 136 079,57 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 13 600,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр. Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы затрат за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **27 мая 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 11.05.2020 по 25.05.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-58, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

## Извещение о проведении 22 мая 2020 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| **Предмет торгов** |
|---|
| Капитальное строение с инв. № 500/С-59 (наименование – Здание кафе с конференц-залом, площадь – 1029,8 кв. м, составные части и принадлежности: площадка (литер а), проезд (литер б), площадка под склад (литер в), дорожка (литер г), дорожка (литер д), дорожка (литер е), площадка под мусоросборники (литер з), эстакада (литер к), въезд (литер л), ограждение (литер м), ограждение (литер н), ограждение (литер о), ворота распашные (литер п), ворота откатные (литер р), ворота распашные (литер с), бордюр 0,08 (литер т), бордюр 0,16 (литер у)), расположенное по улице Селицкого,115/1 в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-30562 (наименование – Проходная З 1/К, площадь – 20,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого,115/2 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-7058487 (наименование – Гараж, площадь – 1 235,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого,113-2 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793112 (наименование – Помещение неустановленного назначения (вент. камера), площадь – 96,6 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-13 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793076 (наименование – Помещение многофункциональное, площадь – 1 076,3 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-14 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-708114019 (наименование – Производственное помещение, площадь – 144,6 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-15 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-708114020 (наименование – Административное помещение, площадь – 15,8 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-15а в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-708124027 (наименование – Административное помещение, площадь – 920,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-16 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-708124028 (наименование – Помещение неустановленного назначения, площадь – 176,2 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-16а в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793079 (наименование – Помещение неустановленного назначения, площадь – 27,7 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-17 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793081 (наименование – Помещение неустановленного назначения, площадь – 13,8 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-19 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793082 (наименование – Помещение неустановленного назначения, площадь – 42,9 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-20 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793083 (наименование – Помещение стоматологии, площадь – 49,3 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-21 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793084 (наименование – Административное помещение, площадь – 17,3 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-22 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-707947946 (наименование – Помещение здравоохранения, площадь – 14,9 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-23 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793086 (наименование – Административное помещение, площадь – 16,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-24 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793087 (наименование – Административное помещение, площадь – 32,6 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-25 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793088 (наименование – Помещение санитарно-бытового назначения, площадь – 12,8 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-26 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793089 (наименование – Административное помещение, площадь – 15,7 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-27 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793090 (наименование – Административное помещение, площадь – 31,1 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-28 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793091 (наименование – Административное помещение, площадь – 30,5 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-29 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793092 (наименование – Административное помещение, площадь – 14,3 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-30 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793099 (наименование – Административное помещение, площадь – 152,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-37 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793100 (наименование – Административное помещение, площадь – 40,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-38 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793105 (наименование – Административное помещение, площадь – 14,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-43 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793106 (наименование – Административное помещение, площадь – 16,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-44 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793107 (наименование – Административное помещение, площадь – 32,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-45 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793108 (наименование – Административное помещение, площадь – 32,9 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-46 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793109 (наименование – Административное помещение, площадь – 31,6 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-47 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793110 (наименование – Помещение неустановленного назначения, площадь – 251,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-48 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793111 (наименование – Помещение неустановленного назначения, площадь – 102,7 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-49 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-707947947 (наименование – Помещение стоматологии, площадь – 30,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-50 в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019226 (наименование – Ливневая канализационная сеть, протяженность сети – 833,1 м), расположенное по улице Селицкого, 113 (от ЛК-сущ, до ЛК-46) в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019229 (наименование – Тепловая сеть, протяженность – 165,3 м), расположенное по адресу: внутриплощадочная тепловая сеть по улице Селицкого, 113 в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019230 (наименование – Сеть наружного освещения, протяженность – 458,1 м), расположенное по улице Селицкого, 113 в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019228 (наименование – Хозяйственно-фекальная канализационная сеть, протяженность – 944,1 м), расположенное по улице Селицкого, 113 (КК-1-КК-39 (сущ.)) в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019227 (наименование – Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, протяженность – 833,1м), расположенное по улице Селицкого, 113 (от ВК-сущ, до ВК-2) в городе Минске;<br>водомерный узел (инв. № 6500, 2010 года выпуска), задвижка с электроприводом (инв. № 131033, 2005 года выпуска), задвижка с электроприводом (инв. № 131032, 2005 года выпуска), насос ВРН 60/250 40 м (инв. № 1416, 2004 года выпуска), шкаф гардеробный с антресолью 2500*2100*560 (инв. № 2004, 2010 года выпуска), шкаф гардеробный с антресолью 2500*2300*600 (инв. № 01038, 2009 года выпуска), шлагбаум WIL6/A в комплекте (Селицкого) (инв. № 47074, 2012 года выпуска);<br>дерево (алыча) инв. №010, дерево (алыча) инв. № 011, дерево (алыча) инв. № 012, дерево (алыча) инв. № 013, дерево (береза повислая) инв. № 015, дерево (боярышник обыкновенный) инв. № 016, дерево (ель колючая голубая) инв. № 017, дерево (ель колючая голубая) инв. № 018, дерево (ель колючая голубая) инв. № 019, дерево (ель колючая голубая) инв. № 020, дерево (ель колючая голубая) инв. № 021, дерево (ель колючая голубая) инв. № 022, дерево (ель колючая голубая) инв. № 023, дерево (робиния лжеакация) инв. № 026, дерево (робиния лжекация) инв. № 025, дерево (слива домашняя) инв. № 028, дерево (слива домашняя) инв. № 029, дерево (слива домашняя) инв. № 027/ (далее – имущество) |
| Местонахождение: г. Минск, ул. Селицкого, 113, 113А, 113-2, 115/1, 115/2 |
| Сведения о земельных участках: кадастровый номер 500000000002009190, площадь – 0,3308 га (доля в праве аренды: 2/5); кадастровый номер 500000000002009194 площадь – 1,8216 га |
| Начальная цена: 2 208 581,78 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 220 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.**

**Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.**

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **22 мая 2020** года в **09.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 11.05.2020 по 20.05.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
(017) 327-48-36
(государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **государственное предприятие «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ»** (УНП 690608054) в лице антикризисного управляющего ООО «ПрофДМ», тел. +375 (17) 395-81-34.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **26 мая 2020 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Кран башенный | 5640,00 |
| 2 | Станок строгальный 4-х | 2080,00 |
| 3 | Пилорама Р63 4 Б | 2000,00 |
| 4 | Станок угло-зачист. СА-606 | 1080,00 |
| 5 | Стол для раскроя стекла | 8400,00 |
| 6 | Пила для резки дистанц. проф. | 1400,00 |
| 7 | Экструдер гидравлический | 13120,00 |
| 8 | Оборудование для засыпки сита | 1240,00 |
| 9 | Кондиционер для охлаждения | 2280,00 |
| 10 | Бутилэкструдер 7,5 кг | 6280,00 |
| 11 | Авт. линия для производства стеклопакетов | 23920,00 |
| 12 | Электропневматический стол | 1760,00 |
| 13 | Пресс ZPX 14378 | 1200,00 |

**Местонахождение: Минская обл., г. Молодечно, ул. Сухая, 73, тел. для осмотра 8 (029) 605 53 42.**

